№№79–80
(2807–2808)

29 мая 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ПАЛІТЗАЧЫСТКА

Маладыя «завочнікі»

Апошнім часам пайшла нейкая "мода" на прысуды маладзёжным актывістам з фармулёўкай "суд асудзіў да завочнага арышту". Што ж гэта за з'ява такая — "завочны арышт"?

— Па 7 сутак завочнага арышту нядаўна атрымалі Зміцер Дашкевіч, Артур Фіньковіч, Зміцер Хведарук і Павел Юхневіч, — расказвае маладзёжны актывіст Барыс Грэцкі. — Справа ў тым, што падчас іх затрымання і складання пратаколаў з усіх узялі распіскі, што затрыманыя просяць разгледзець справы ў судзе ў іх адсутнасць. І яны напісалі такія распіскі, каб не заставацца ў пастарунку, пасля чаго суды завочна разгледзелі іх справы і вынеслі па 7 сутак арышту. Недзе праз 5—6 дзён пасля вынясення прысудаў хлопцы атрымалі судовыя пастановы поштай, а да некаторых ужо наведваліся і міліцыянеры. І гэта азначае, што хлопцы павінны будуць рана ці позна адсядзець гэтыя "суткі". Як толькі іх затрымаюць.

— Але ж яшчэ ніхто не адсядзеў...

— Ніхто. І такое ўражанне, што пакуль яны асабліва нікому не патрэбны. Але, думаю, пра іх абавязкова ўспомняць перад якой-небудзь палітычнай акцыяй.

Хлопцы, якіх завочна прыгаварылі да арышту, знаходзяцца ў Беларусі і ад міліцыі не хаваюцца. Але па нейкай прычыне іх пакуль не арыштоўваюць. Магчыма, чакаюць чарговай акцыі апазіцыі — і ўжо тады, напярэдадні...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

РАЗБОРКІ

Міністры могуць застацца без летняга адпачынку

Няма інвестыцый — няма адпачынку. Такая змрочная перспектыва пагражае кіраўнікам міністэрстваў і ведамстваў, калі яны не актывізуюцца ў прыцягненні замежнага капіталу ў свае галіны.

Гэта паабяцаў ім прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі 27 мая на пасяджэнні Саўміна, дзе разглядаліся вынікі працы эканомікі за першыя чатыры месяцы гэтага года.

Прэм'ер застаўся вельмі незадаволены тым, як прыцягваюць прамыя замежныя інвестыцыі міністэрствы прамысловасці, транспарту і камунікацый, а таксама энергетыкі. У прыватнасці, Мінпрам "здабыў" у першым квартале ўсяго 150 тыс. долараў інвестыцый, Мінтранс — 16 тысяч... "Што, у нас усё добра? За гэтыя грошы можна вырашыць усе праблемы?", — абураўся Сяргей Сідорскі. Дасталася "на арэхі" і начальніку Беларускай чыгункі — за тое, што не займаецца абнаўленнем рухомага саставу.

Увогуле, калі міністры не возьмуцца за розум, то могуць пазбавіцца свайго летняга адпачынку. "Лета ўсіх расслабляе? Дык мы адпачынак адменім", — прыводзіць "Інтэрфакс" словы старшыні ўрада.

За 4 месяцы ў эканоміку прыцягнута інвестыцый на суму больш за 2 млрд долараў, але гэта банкаўскія крэдыты. Прамых замежных інвестыцый нашы чыноўнікі знайшлі толькі на 716 млн долараў.

БЛІЦ-ОПРОС

Людмила ГРЯЗНОВА:

"Если власть не изменит условий наблюдения за выборами, не появятся возможности участия представителей от оппозиции в избирательных комиссиях, если мы будем видеть, что выборы снова превращаются в фарс, то всем кандидатам от ОДС необходимо будет сниматься с таких выборов".

("Народная воля", 14 мая 2008 г.)

ВЫ СОГЛАСНЫ С ЭТИМ?

Петр МИГУРСКИЙ, кандидат экономических наук:

— Я не сторонник ОДС. Считаю, что это непродуктивная организация. Но позицию Людмилы Грязновой поддерживаю.

Дмитрий ЯНЕНКО, 1-й секретарь ЦК ВЛКСМ Беларуси:

— На мой взгляд, в выборах надо участвовать. Потому что сегодня это единственная легальная возможность дойти до людей и рассказать им, что могут Объединенные демократические силы, к чему стремятся и что намерены делать в случае попадания в парламент.

Что касается предложения бойкотировать выборы, то я его не поддерживаю. Сегодня мы не можем провести полноценную кампанию бойкота, такую, чтобы люди не пошли на выборы. Более того, разговоры о бойкоте я считаю вредными, потому что если оппозиция снимается с выборов, то тогда Александр Лукашенко запросто может провести реально честные выборы. Те люди, которых сегодня назначают в парламент, могут быть реально избраны. И тогда у наблюдателей не будет никаких вопросов по данной теме.

Ирина НЕСТЕРОВИЧ, домохозяйка:

— А у нас что, скоро выборы? Какие? Я в последнее время политикой совершенно не интересуюсь. Какой смысл? Мне сложно рассуждать о том, чего я не знаю.

Владимир ХАЛИП, кинорежиссер:

— Согласен. Я думаю, что выдвигать кандидатов от демократических сил не стоит, потому что власть отказала оппозиции в ее предложении по изменению Избирательного законодательства. А участовать в выборах на условиях, которые предлагает власть, совершенно бессмысленно. От избирателей на таких выборах ничего не зависит, как власти решат, те кандидаты и станут депутатами.

Идти на эти выборы, на мой взгляд, — легитимизировать совершенно нелегитимное образование, которое именуется "палаткой". Участие политиков в этих выборах, на мой взгляд, приведет только к разочарованию избирателей и расколу среди демократических сил. Это фарс, и фарсом останется, пока у власти будет гражданин Лукашенко.

Ольга АНДРЕЕВА, психолог:

— Однозначного ответа у меня нет. Отказываться от борьбы, наверное, неправильно. Потому что есть возможность общаться с людьми и доносить до них свои идеи. Это полезно и с точки зрения тренировки психологических навыков и состояний: попробовал один раз — и уже не боишься. С другой стороны, когда все выборы действительно превращаются в фарс, может быть, есть смысл изначально в них не участвовать и не ходить голосовать.

Станіслаў СУДНІК, журналіст, сябра сойму Партыі БНФ:

— Меркаванне паважанай Людмілы Гразновай мяне не цікавіць. Я з ім не згодны. Мяркую, што вырашаць, як паводзіць сябе на выбарах кандыдатам ад АДС, будзе не яе меркаванне, і нават не меркаванне АДС, а рашэнне палітычных партый у залежнасці ад таго, якія мэты гэтыя партыі пераследуюць. Калі партыя пераследуе мэту мабілізаваць свае рэсурсы, актывізаваць людзей у рэгіёнах, то якраз выкарыстоўваць выбары і трэба. Пакуль Партыя БНФ прытрымліваецца пазіцыі ўдзельнічаць у выбарах.

Татьяна ЗЕЛКО, пенсионерка:

— Готова подписаться под каждым словом Грязновой. В этом фарсе нет никакого смысла участвовать. Я тоже могла бы подготовить документы и выдвинуться в кандидаты в депутаты. Но я не уверена, что борьба за избирателей будет честная, что члены комиссий не будут рисовать нужные властям цифры в протоколах. Участие представителей оппозиции в таких выборах на руку властям, потому что картинка получается красивая.

Константин ЛУКАШОВ, кандидат в депутаты на выборах 2004 года:

— Мне кажется, что никаких "если" не должно быть. Вообще, наивное желание оппозиции из года в год увидеть изменения нашего режима мне кажется странным. Режим такой, какой он есть. И никакие призывы и декларации его не изменят.

Совершенно не понятна и позиция ОДС в плане выборов. Если люди борются за власть, они концентрируют все ресурсы для достижения результата. И даже в современной Беларуси, если бы ОДС выставило не 110 кандидатов по всей стране, а 10, например, в Минске и в команду каждого кандидата вошло человек 500—600, можно было бы и при нынешнем Избирательном кодексе на что-то влиять. Ведь проблема не только в Избирательном кодексе, но и в информационном пространстве. А за два месяца, отведенные на избирательную кампанию, оппозиция при таком подходе к выборам, я имею в виду равномерное расплескивание ресурсов по всей стране, не сможет повлиять на людей. К сожалению, и Объединенные демократические силы должны это признать, оппозиция в глазах населения — это неудачники.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Чыноўнікаў пакараюць

Кіраўнікі канцэрнаў "Беллеспрам", "Беллеспаперапрам", "Белбіяфарм" будуць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці за невыкананне бізнес-планаў на падначаленых ім прадпрыемствах. Пра гэта паведаміў на пасяджэнні Савета міністраў у Мінску міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка.

Невыкананне бізнес-планаў у канцэрне "Беллеспаперапрам" склала 70,3%, "Белбіяфарм" — 66,7%, "Беллеспрам" — 61,2%, паведамляе "Інтэрфакс".

Апрача таго, да дысцыплінарнай адказнасці будзе прыцягнута кіраўніцтва Гомельскага аблвыканкама і шэрагу прадпрыемстваў вобласці за невыкананне бізнес-планаў I квартала.

Заробкі павысяцца толькі ў кастрычніку

У кастрычніку ў Беларусі плануецца павысіць тарыфную стаўку 1-га разраду да 94 тыс.руб. Пра гэта было паведамлена на пасяджэнні беларускага ўрада.

На канец 2008 года сярэдні заробак, па прагнозах, павінен скласці 960 тысяч рублёў, або ў эквіваленце 460 долараў.

Мяжу падкопваюць нават лыжкамі

Сярод парушальнікаў беларускай мяжы пераважна працоўныя нелегалы і грыбнікі, паведаміў старшыня Дзяржаўнага памежнага камітэта (ДПК) Беларусі Ігар Рачкоўскі, перадае "Інтэрфакс": "Асноўная катэгорыя нелегалаў — працоўныя мігранты, якія спрабуюць патрапіць у ЕС, перадусім праз мяжу з Польшчай. Трапляюцца пераважна грамадзяне Малдовы, Шры-Ланкі, В'етнама, Кітая, Індыі, Пакістана". Кажучы пра вынаходлівасць парушальнікаў, суразмоўца агенцтва распавёў, што памежнікі сутыкаліся з выпадкамі, "калі над "сістэмай" — інжынернай мяжой — паміж дрэвамі нацягвалі горны трос, па якім перамяшчаліся". "Ладзілі падкопы, — капалі лыжкамі, кубкамі, нават лыжачкамі для абутку", — дадаў ён.

НАША ГІСТОРЫЯ

Памяць Курапатаў

Дваццаць гадоў таму, 3 чэрвеня 1988 года, Беларусь прачнулася іншай.

Яна пакуль яшчэ абудзілася пад гімн СССР і БССР па "радыёкропцы", як і дзесяцігоддзі, кіравалася з Масквы, рашэннямі ЦК КПСС і яго Палітбюро, што педантычна выконваліся ў ЦК КПБ, і знешне ні ў Мінску, ні ў іншых гарадах ці ў вёсках ўсё заставалася па-ранейшаму, але з гэтага дня Беларусі было наканавана змяніцца.

У той дзень штотыднёвік "Літаратура і мастацтва", які рэдагаваў Анатоль Вярцінскі, надрукаваў артыкул Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва "Курапаты — дарога смерці". (Пісаў артыкул ад першага да апошняга слова адзін Пазьняк, але палічыў тактоўным узяць у сааўтары калегу, з якім праводзіў даследаванне.) З дзвюх назваў гэтай мясцовасці — агульнапрынятай "Брод" і малавядомай лакальнай "Курапаты"— Пазьняк выбраў апошнюю, палічыўшы, што яна дае больш поўнае адлюстраванне з'явы. Тое, як удалося надрукаваць артыкул, — асобная тэма, якая, бясспрэчна, павінна быць зафіксавана для гісторыі. Але сёння — пра вынік.

У тыя часы гарбачоўскай "перабудовы" пра рэпрэсіі ў афіцыйнай прэсе пісалася шмат. Чаму ж менавіта адкрыццё Курапатаў мела такі моцны эмацыйны і пазней — палітычны эфект?

Тагачаснае камуністычнае кіраўніцтва БССР калі і не адмаўляла наяўнасць рэпрэсій, дык сцвярджала, што гэта — "скажэнне ленінскай палітыкі". Абвергнуць факт расстрэлаў і катаванняў ім было немагчыма, але лёгка ствараласа ўражанне, што ўсё гэта было не на беларускай зямлі, а недзе далёка — у Магадане, Сібіры, Казахстане ці на маскоўскай Лубянцы. Газеты пісалі пра трагічныя лёсы Бухарына, Рыкава, Каменева — прадстаўнікоў партыйнай эліты (не менш вінаватых у прыходзе да ўлады бальшавікоў на чале з Леніным, чым сам Сталін).

Пазьняк сказаў (упершыню), што забівалі вось тут, побач, дзе ты ці твой знаёмы ў мінулую суботу з кампаніяй смажылі шашлыкі. Пазьняк цытаваў расповеды жыхароў навакольных вёсак, і нешта жахлівае было ў тым спалучэнні будзённасці і трагедыі, якая ажывала ў словах сведкаў. Пазьняк даказаў, што знішчалі не толькі вышэйшую наменклатуру, не толькі інтэлектуальную эліту (хаця, канешне, вынішчаць імкнуліся найперш эліту, ды і нацыянальна арыентаванае кіраўніцтва таксама), — забівалі тысячы простых сялян, тысячы звычайных рабочых.

Пазьняк даў прыблізную лічбу забітых у Курапатах — не менш за 102 тысячы чалавек (у кожным пахаванні ў сярэднім 200 нябожчыкаў). Але рэальная лічба, пісаў ён, большая, бо колькасць пахаванняў магла дасягнуць 900 — значыць, колькасць забітых сягае за 200 тысяч. Гэта больш, чым колькасць жыхароў у сённяшнім Полацку і Наваполацку разам узятых. (Прыкметна, што нават энцыклапедычны слоўнік "Беларусь", выдадзены ўжо пры Лукашэнку, падае лічбу 50 тысяч чалавек.)

(Заканчэнне на 2-й стар.)

КОММЕНТАРИЙ

Налог на уровне 12 процентов: выиграем все?

Как стало известно, в стране предполагается перейти на единую ставку подоходного налога на уровне 12%. Эта мера коснется практически всех.

В Минфине уже подготовлен проект, но окончательное решение по этому вопросу еще не принято. Кстати, на заседании президиума Совмина, на котором обсуждался проект основных направлений бюджетно-налоговой политики на 2009 год, говорилось, что предполагается перейти на единую ставку подоходного налога на уровне 12%.

Сейчас белорусы отчисляют налог в государственную казну по прогрессивной системе. Для физических лиц, в зависимости от дохода, действуют пять ставок — от 9 до 30%. Переход к единой для всех шкале значительно упростил бы порядок взимания основного налога. По мнению экспертов, это также позволит отказаться от зарплат в конвертах.

Изменения в налогообложении можно ожидать только в начале будущего года. По данным Минфина, единая ставка подоходного налога на уровне 12% не ухудшит положение большинства граждан. Однако, как сообщают СМИ, ранее Министерство по налогам и сборам распространило информацию, согласно которой средняя ставка изъятия подоходного налога в Беларуси последние несколько лет составляет 10%, а в 2007 году составила 10,5%. То есть можно ожидать, что 12%-ная ставка приведет к тому, что большинству граждан придется увеличить процент отчислений по подоходному налогу.

Ясно же, что при переходе на единую ставку подоходного налога на уровне 12%, те, кто платит сейчас 20 и 30% налога, выигрывает. То есть богатые будут платить меньше. А бедные, кто сейчас платит 9—10%, заплатят больше. Вот такая арифметика. Правда, экономисты Ярослав Романчук и Леонид Злотников считают, что у государства есть возможности минимизировать потери бедных.

Словом, в отношении граждан, которые сегодня уплачивают налог по ставке 9%, придется создавать какой-то компенсационный механизм. Ведь увеличение налога на 3 процентных пункта существенно отразится на кармане небогатых белорусов. Как стало известно "Экономической газете", в министерствах прорабатываются варианты компенсации снижения доходов из-за увеличения минимальной ставки налога.

Конечно, единая ставка налога на уровне 12% имеет и свои преимущества. Она, скорее всего, позволит не только значительно упростить порядок взимания налога, но и повысить собираемость средств, а также можно рассчитывать на привлечение капитала из-за рубежа, который охотнее приходит туда, где меньше налоги. Заметим, что в России единая ставка налога составляет 13%. Правда, экономисты считают, что для привлечения инвесторов одной этой меры недостаточно, нужны и другие.

Но как же быть с теми, кто платит налог на уровне 9—10%?

Андрей РУСАКОВИЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 МАЯ 2008 г.

НАША ГІСТОРЫЯ

Памяць Курапатаў

Дваццаць гадоў таму, 3 чэрвеня 1988 года, Беларусь прачнулася іншай.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Больш як 200 тысяч чалавек — гэта ўсё ж не "асобныя прадстаўнікі" народа і нават не "шырокае кола прадстаўнікоў". Гэта ўжо — сам народ.

І, нарэшце, ён сказаў, што знішчалі — менавіта беларускі народ. У апошніх радках артыкула прагучала слова "генацыд". Ужо пазней даследчыкамі было даказана, што сярод тых, хто расстрэльваў, адзінкі паходзілі з Беларусі — у канцы 30-х гадоў НКВД было сфарміравана пераважна з выхадцаў з расійскіх абласцей.

Было ўпершыню сказана пра мэтанакіраванае знішчэнне нацыі — і нацыя ўспрыняла, адгукнулася яднаннем, самааргранізацыяй. Мне ўжо даводзілася пісаць, што перыяд апошняга нацыянальнага Адраджэння вызначаны дзвюма датамі — публікацыяй артыкула пра Курапаты 3 чэрвеня 1988 года і "рэферэндумам" 14 мая 1995 г. аб лёсе (лёсе ў лукашэнкаўскай Беларусі, канешне, а не ў вечнасці) бел-чырвона-белага сцяга, "Пагоні" і беларускай мовы.

Менавіта артыкул у ЛіМе даў штуршок да стварэння 19 кастрычніка 1988 года "Мартыралога Беларусі" і аргкамітэта БНФ. Абапіраючыся на Народны фронт і яго дэпутацкую групу ў Вярхоўным Савеце, Пазьняк здолеў не толькі абвясціць ідэю беларускай Незалежнасці, але і рэалізаваць яе палітычна. 27 ліпеня 1990 года была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце, а 25 жніўня 1991 года ёй быў нададзены статус канстытуцыйнай сілы. Гэта быў рэальны палітычны вынік. Ён быў дасягнуты шмат якімі прагматычнымі, матэматычна выверанымі крокамі лідэра БНФ — і падтрымкай тысяч актывістаў Народнага фронту, прыхільнікаў дэмакратыі, якія выходзілі на плошчу перад Домам урада. Але сімвалічна, што пачатак такога рэальнага палітычнага выніку бярэ пачатак у духоўным — у вяртанні нацыі памяці пра Курапаты, дзе палеглі і тыя, хто ўтварыў 25 сакавіка 1918 г. Беларускую Народную Рэспубліку, ды так і не пабачыў ідэю беларускай дзяржаўнасці рэалізаванай...

Ёсць яшчэ адзін аспект, у той час не заўважаны грамадствам, але, пэўна ж, дакладна пралічаны тымі, хто ўспрыняў артыкул як удар па сваіх ідэалах. Адкрыццё Курапатаў — гэта і знаходкі матэрыяльных доказаў для магчымага судовага працэсу над камунізмам. Выступы і рэзалюцыі XX і XXII партыйных з'ездаў з асуджэннем "культу асобы" могуць быць спісаныя на палітычную барацьбу партыйных кланаў ці ўспрынятыя як ускосныя доказы. Прастраляныя чарапы, косці, кулі ад наганаў — гэта ўжо прамыя доказы. Магчыма, у гэтым і ёсць адна з галоўных прычын нянавісці, якую маюць да Пазьняка палітычныя спадкаемцы бальшавікоў.

Уступ да артыкула напісаў Васіль Быкаў, і пазней, на Дзяды, Васіль Уладзіміравіч заўсёды прыходзіў на шэсце ў Курапаты, якое ладзіў Беларускі Народны Фронт.

На тыя шэсці збіраліся мы звычайна каля вядомага дома на пачатку галоўнага праспекта сталіцы і ставілі шыльду: "Адсюль, з будынка НКВД, пачынаўся пакутны шлях у Курапаты. Вечная памяць ахвярам бальшавіцкага тэрору!" Быкаў казаў кароткую прамову, выступалі Рыгор Барадулін, вязень ГУЛАГа Сяргей Грахоўскі, а потым рушылі па праспекце — да саміх Курапатаў.

Шыльда ля былога НКВД назаўтра, канешне, знікала. У гэтым доме (пасля вайны ён разбудаваны ў квартал карпусоў) цяпер захоўваюцца ўсё яшчэ не рассакрэчаныя тысячы, дзесяткі тысяч спраў і забітых, і тых, хто забіваў.

Якія такія дзяржаўныя таямніцы ўтрымліваюць тыя паперы, што і праз семдзесят год яны маюць грыф "сакрэтна"? Якія таямніцы ахоўвае дзяржава? Метады вярбоўкі стукачоў, парадак афармлення палітычных даносаў? Тэхналогію забойства двух чалавек адной куляй (гэтак часта рабілі ў Курапатах)? Спосабы пахавання трупаў у некалькі слаёў?

Гэта таму сакрэтна, таму важна, што — спатрэбіцца? І ці трэба разумець, што, калі КДБ перахоўвае таямніцы НКВД, яно з'яўляецца спадкаемцам (духоўным і палітычным) гэтага самага НКВД?

Нядаўна новапрызначаны кіраўнік "ідэалагічнага ўпраўлення" на пытанне, чаму адкрыта "лінія Сталіна", адказаў, што існуюць людзі, для якіх з імем Сталіна звязаны іх маладыя, лепшыя гады і перамогі падчас вайны. І што іх пачуцці трэба паважаць. Уявіце, што ў сучаснай Нямеччыне архівы СС — засакрэчаныя (бо нельга выдаваць прафесійныя таямніцы спецслужбаў). Што ёсць вуліцы Гітлера і Гімлера — бо, маўляў, жывуць яшчэ тыя, для каго вобраз фюрэра і ягоных паплечнікаў атаясамліваецца з іх маладосцю, з энтузіязмам будаўніцтва першых аўтабанаў, з перамогамі на Заходнім і Усходнім франтах...

Паважаючы пачуцці прыхільнікаў Сталіна, улада ні словам, ні справай не прыгадвае пра пачуцці былых вязняў ГУЛАГа, родных і блізкіх тых, хто расстраляны ў Курапатах. Ужо пры Лукашэнку іх пазбавілі нешматлікіх ільгот (значна меншых за тыя, што ў ветэранаў НКВД-КДБ).

Пагаджуся з тымі, хто кажа, што нельга параўноўваць нацызм з камунізмам, СС з НКВД-КДБ. Нацызм праіснаваў толькі дванаццаць гадоў — камунізм больш як семдзесят, і колькасць ахвяраў камунізму значна перавышае колькасць тых, хто загінуў ад рук нацыстаў. І ўсё ж справа не толькі ў лічбах. Калі тады, на мяжы 1980—1990 гадоў, Пазьняк казаў пра неабходнасць суда над камунізмам па тыпу Нюрнбергскага, ён падкрэсліваў, што гаворка найперш пра асуджэнне ідэалогіі, без чаго ісці далей будзе немагчыма.

Але тыя, хто здзекаваўся з той ідэі, жадалі рухацца не наперад, а назад.

Дайшлі да "лініі Сталіна". Цяпер туды, а не ў Курапаты, возяць экскурсіі.

За дваццаць гадоў у Курапатах былі прэзідэнты, лаўрэаты Нобелеўскай прэміі, замежныя дыпламаты — Лукашэнка ніводнага разу не прыехаў. Прыкметна і тое, што, знаходзячы і караючы аўтараў надпісу "Жыве Беларусь!", міліцыя і спецслужбы ніколі не адшукалі тых, хто разбіваў памятны знак Клінтана, ламаў крыжы, апаганьваў магілы.

У пачатку 90-х гадоў адмысловая камісія павінна была прапанаваць праект мемарыяла ў Курапатах. Ці то сутыкнуліся амбіцыі скульптараў і архітэктараў, ці то адмыслова справа была зацягнутая да моманту, калі рэпрэсіі зноў вярнуліся ў арсенал улады — але ідэя мэмарыяла не ажыццявілася. Аднак часам мне падаецца, што ў гэтым ёсць пэўны глыбокі сэнс. І не толькі таму, што нават самы лепшы праект не можа быць адэкватны маштабу нацыянальнай трагедыі. Добра разумеючы сутнасць цяперашняй улады, простыя людзі прыходзяць і ўсталёўваюць тут крыжы. Кожную суботу актывісты Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ ладзяць тут талаку, расчышчаюць зямлю ад смецця.

Ствараецца сапраўды народны мемарыял. І, канечне, памяць — не ў мармуры, а ў сэрцах.

Сяргей НАВУМЧЫК.

Прага.



«Гэта працяг расправы над моладдзю»

У судзе Цэнтральнага раёна Мінска разгледжана так званая "справа 14". Нагадаем: маладых людзей, якія праходзілі па гэтай крымінальнай справе, абвінавачвалі ў *"арганізацыі дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак"*. Меліся на ўвазе падзеі, якія адбыліся ў Мінску ў студзені бягучага года, калі падчас несанкцыянаванай акцыі прадпрымальнікаў, пратэстуючых супраць указа №760, мітынгоўцы перакрылі праспект Незалежнасці.

На гэты раз у якасці падсудных выступалі трое -- Павел Вінаградаў, Міхаіл Субач і непаўнагадовы Максім Дашук. Дарэчы, толькі Субач мае дачыненне да прадпрымальніцтва -- ён уладальнік вясельнага салона. Вінаградаў і Дашук прыйшлі на акцыю прадпрымальнікаў у знак салідарнасці з імі.

Справу разглядаў суддзя Валерый Есьман. Пачатак слуханняў быў запланаваны на 23 мая, але па незразумелых прычынах быў перанесены на панядзелак, 26-е.

Абвінавачаныя сваёй віны ў судзе не прызналі, а Павел Вінаградаў увогуле выказаў недавер суду. Тым не менш працэс распачаўся.

Падтрымліваючы абвінавачванне, пракурор Лук'янаў адзначыў, што хлопцы прымалі ўдзел у мітынгу, ведаючы, што ён несанкцыянаваны, акрамя таго, Вінаградаў, Субач і Дашук, па версіі пракурорскага работніка, выкрыквалі лозунгі і вялі за сабой астатніх мітынгоўцаў, на заўвазі супрацоўнікаў міліцыі не рэагавалі...

На думку Лук'янава, сваімі дзеяннямі маладыя людзі нанеслі ўрон дзяржаўным прадпрыемствам на суму, большую за 124 мільёны рублёў.

Усе трое не сталі даваць суду паказанні наконт сваіх дзеянняў падчас студзеньскага мітынгу.

У судзе былі заслуханы паказанні сведак -- прадстаўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў, а таксама КУП "Мінсктранс". Усе яны заявілі, што матэрыяльных прэтэнзій да абвінавачаных не маюць, а прадстаўнік КУП "Мінсктранс" паведаміў, што рух аўтобусаў па плошчы Незалежнасці 10 студзеня быў прыпынены на нейкі час.

Калі прыгадаць мінулы аналагічны працэс, падчас якога на лаве падсудных апынуўся Андрэй Кім і яшчэ васьмёра ягоных паплечнікаў, то абвінавачванне тады ў большай ступені абапіралася на сведчанні супрацоўнікаў ДАІ. На судовае пасяджэнне па справе Вінаградава, Дашука і Субача таксама былі выкліканы ў якасці сведак прадстаўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Праўда, яны шчыра прызналі, што бачаць абвінавачаных упершыню і толькі намеснік начальніка мінскай ДАІ цвёрда прызнаў у Дашуку і Субачу "актыўных удзельнікаў несанкцыянаванага мітынгу". Акрамя таго, як засведчыў суду Максім Падбярозкін, актыўных мітынгоўцаў было блізу дваццаці чалавек, і яны нібыта абражалі і нават білі па нагах супрацоўнікаў ДАІ.

Суддзя Валерый Есьман прызнаў Паўла Вінаградава, Максіма Дашука і Міхаіла Субача вінаватымі і прыгаварыў: Субача і Вінаградава да 2 гадоў абмежавання волі, а непаўнагадоваму Максіму Дашуку далі 1,5 года абмежавання волі.

Назіраючы за судовым працэсам, адзін з лідэраў прадпрымальніцкага руху Аляксандр Макаеў коратка пракаментаваў прысуд: "Гэта працяг расправы над моладдзю".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ІНЦЫДЭНТ

Мілінкевіча закідалі яйкамі...

На мінулым тыдні лідэр ствараемага руху "За Свабоду" сустракаўся з прадпрымальнікамі і наведвальнікамі Смаленскага рынку, што ў Віцебску. Старшынёй савета прадпрымальнікаў на гэтым рынку быў Сяргей Парсюкевіч, якога пасадзілі за краты нібыта за супраціўленне міліцыі.

Па словах прадпрымальнікаў, з 1 ліпеня рынак будуць рэканструяваць і іх збіраюцца выселіць.

— Не ведаю, як мы пражывём на 300 тысяч, а такі ў сярэднім заробак прадпрымальніка ў Віцебску. Кошты з кожным годам растуць. Зараз на рынку працуе толькі 500 чалавек, хаця працоўных месц 1200, — расказвае прадпрымальніца Алена. — На 40 працэнтаў павысіліся падаткі за апошні час.

— Прадпрымальнікі ўспаміналі пра Сяргея Парсюкевіча, вельмі перажываюць за яго, — адзначыў Аляксандр Мілінкевіч. — Усе пытаюцца, што зрабіць, каб вызваліць гэтага чалавека.

Напрыканцы сустрэчы невядомы кінуў у А.Мілінкевіча два яйкі. Палітык Павел Севярынец затрымаў маладзёна.

Студэнт гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта Аляксей Мітрафанаў *(на здымку ў цэнтры)* заявіў, што здзейсніў свой учынак наўмысна і што з'яўляецца сябрам Нацыянал-бальшавіцкай партыі.

На Мітрафанава завялі адміністрацыйную справу.

Яшчэ адна нерэгістрацыя

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь адтэрмінавала рашэнне аб рэгістрацыі грамадскага аб'яднання "Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў", сярод заснавальнікаў якога прыхільнікі ствараемага Аляксандрам Мілінкевічам руху "За Свабоду".

У адказе напісана, што станоўчае рашэнне не можа быць прынята, паколькі пэўныя пункты ў статуце аб'яднання не ў поўнай ступені адпавядаюць патрабаванням арт.9 і 10 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях". У сувязі з гэтым міністэрства дае месяц на выпраўленне ўсіх недахопаў і прапануе потым падаць новую заяву на рэгістрацыю.

— Я лічу, што прычына нерэгістрацыі зусім не ў неадпаведнасці дакументаў. Проста ўлада нас баіцца пускаць на арэну. Яна баіцца, што мы падымем голас у абарону сябе і сваіх дзяцей, — адзначыў кіраўнік аб'яднання, акадэмік Іван Нікітчанка. Мы будзем патрабаваць ад міністэрства канкрэтызаваць заўвагі па нерэгістрацыі нашага аб'яднання. І нават калі нам адмовяць у рэгістрацыі, няхай матывуюць адмову.

Николай Корбут идет на поправку

Министр финансов проходит курс реабилитации в Республиканской клинической больнице медицинской реабилитации в Аксаковщине.

13 марта Николай Корбут перенес обширный инсульт. В тяжелейшем состоянии он был госпитализирован в отделение реанимации Республиканской больницы. Прогнозы медиков были неутешительны. Врачи отказывались от комментариев в прессе. О здоровье своего шефа предпочитали умалчивать и сотрудники Министерства финансов.

Но уже в конце апреля в состоянии здоровья 59-летнего Корбута наметилась положительная динамика. Возможно, это был результат своевременной госпитализации, современной диагностики, которая возможна в президентской больнице, и выбранного оптимального курса лечения.

12 мая министра финансов перевели в Аксаковщину, в один из лучших реабилитационных центров страны.

— Мы навещали Николая Петровича несколько раз, — сказали нам в приемной министра финансов. — Чувствует он себя хорошо. Ему назначили много процедур. Речь практически полностью восстановилась, он пытается ходить. Пока, правда, с помощью специальных костылей. Даже врачи не верили, что Николай Петрович поправится после такого инсульта. А мы верили. И родственники верили.

По словам пресс-секретаря министра, речь о том, когда Николай Корбут сможет вернуться на работу, пока не идет. Хотя Николай Петрович активно интересуется работой, делами в министерстве. Подчиненные Корбута говорят, что с нетерпением ждут его возвращения. Сейчас обязанности министра финансов исполняет его первый заместитель Андрей Харковец. Николай Корбут возглавляет Минфин с июля 1997 года.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Амністыя завершана. Палітзняволеныя застаюцца ў турмах

Амністыя 2007 года завяршылася 26 мая ў Беларусі. За яе час вызваліліся больш за 2,1 тысячы чалавек. Пра гэта паведаміў "Інтэрфакс" са спасылкай на Дэпартамент выканання пакаранняў МУС Беларусі.

У лік вызваленых увайшлі тыя, хто кампенсаваў матэрыяльныя страты. Агулам асуджаныя кампенсавалі больш за 850 мільёнаў рублёў. Нагадаем, што дэкрэт аб правядзенні амністыі быў падпісаны яшчэ 26 лістапада 2006 года. Па словах начальніка дэпартамента, пад амністыю траплялі 5,5 тыс. асуджаных. Тым, хто не пакрыў нанесеную шкоду, а таксама меў парушэнні, а таксама тым, да каго ўжывалася амністыя раней, цяпер было адмоўлена ў вызваленні.

Дарэчы, па фармальных прыкметах пад амністыю траплялі каля 400 жанчын, аднак былі вызваленыя менш за 150 чалавек.

ДЗІКУНСТВА

Шок: прыязджалі тройчы з няспраўным дэфібрылятарам

Тры брыгады "хуткай дапамогі" павінны былі выратаваць юнаку жыццё, аднак ні ў адной не працаваў дэфібрылятар. Чалавек памёр, а медыкаў нават і не абвінавацілі.

Раённым судом Магілёва разглядаецца крымінальная справа па факце смерці 21-гадовага хлопца, які загінуў у выніку няшчаснага выпадку на будаўніцтве. Галоўны інжынер адкажа за недагляд, а вось "хуткая дапамога", якая магла выратаваць жыццё траўміраванаму, застаецца ў баку.

Выпадак здарыўся на будаўнічых работах у сакавіку мінулага года. Малады электрык уключыў рубільнік, выпадкова ўзяўся за трос пад вялікім напружаннем, і яго адкінула на шэсць метраў. Рабочыя пачалі рабіць масаж сэрца, да хлопца вярнулася дыханне, аднак без электрашоку абысціся было немагчыма.

Неўзабаве прыехала кардыёбрыгада "хуткай дапамогі", аднак абсталяванне чамусьці не працавала. Выклікалі на дапамогу яшчэ адну брыгаду. І зноў прыехала машына з паламаным дэфібрылятарам. Не дапамагла і трэцяя брыгада — зноў не спрацавала абсталяванне. У выніку хлопец загінуў на месцы здарэння. Па факце смерці ўзбудзілі крымінальную справу.

Аднак адказчык у судзе — толькі галоўны інжынер будоўлі. За недастатковае выкананне сваіх службовых абавязкаў, у выніку чаго загінуў чалавек, ён можа быць пазбаўлены волі на тэрмін да пяці гадоў. А хто адкажа за нявыратаванае жыццё маладога чалавека? Хто адкажа за няспраўнае абсталяванне на трох машынах "хуткай", якія маглі б выратаваць жыццё юнака?

СУСЕДЗІ

Беларусам дазволілі месяц жыць у Расіі без рэгістрацыі

Грамадзянам абедзвюх дзяржаў не спатрэбіцца паведамляць аб сваім прыбыцці міграцыйным органам на працягу 30 дзён. Урад Расіі вырашыў ухваліць расійска-беларускую дамову, якая дае грамадзянам дзвюх краін права бесперашкодна падарожнічаць і сяліцца ў любой частцы саюзнай дзяржавы, паведамляе прэс-служба ўрада РФ.

Дамова аб забеспячэнні роўных правоў была падпісана на пачатку 2006 года, аднак дагэтуль не была ратыфікавана. Паводле дакумента, грамадзяне Расіі і Беларусі змогуць атрымліваць дазвол на жыхарства ў абедзвюх краінах і атрымліваць дазвол на часовае пражыванне.

ЗНАЙ НАШИХ!

Учительница из Гомеля стала лучшей писательницей Европы

Международные эксперты признали белоруску Нику Ракитину лучшим молодым писателем-фантастом Европы. Еще ни разу за 36-летнюю историю конкурса, учрежденного Европейским Союзом научной фантастики, наши писатели не получали таких наград. Любопытно, что победу белоруске принес дебютный роман.

8 лет гомельская учительница создавала свою страну. История придуманного государства основана на легендах и преданиях Великого княжества Литовского. Роман "Гонитва" — это эхо "Дикой охоты" Владимира Короткевича. Не случайно саму писательницу литературные эксперты назвали его последовательницей. Любовь, война, дворяне и крестьяне. Ее герои — не эльфы, драконы и колдуны, а легендарные белорусские персонажи. Чтобы собрать воедино историю, пришлось поколесить по Беларуси, Польше и Литве.

Теперь ее фамилия в так называемом элитарном списке. Два года назад специальную премию "Гран-мастер европейской фантастики" получили братья Стругацкие и Гарри Гаррисон. Престижной премии был удостоен и Сергей Лукьяненко — автор "Ночного дозора". В дебютном произведении Ракитиной даже критики отметили высокий профессиональный уровень.

Первые публикации Ники Ракитиной были в университете. В различных газетных изданиях появлялись ее стихи. Но вскоре интерес к стихам поугас, а карьеру писательницы продолжили рассказы и повести. Но интересно, что белорусские издательства творчеством Ники Ракитиной не заинтересовались. Ее печатали в таких журналах и сборниках, как "Реальность фантастики" (Киев), "Хранители миров" (Екатеринбург), "РБЖ Азимут" (Одесса), "Аэлита. Новая волна" (Екатеринбург), в сборниках, выходивших в Москве, Киеве на Урале (и в таких количествах, что автор статьи просто все забыл).

Последнее опубликованное произведение — роман "Гонитва" (издательство "Снежный ком", Рига, 2008).

Елена НОВИКОВА.

ПРАЕКТ

На Дняпры будуць будаваць каскад ГЭС

Аб'яднанне "Белэнерга" прапрацоўвае пытанне аб узвядзенні каскада гідраэлектрастанцый на рацэ Днепр, які будзе ўключаць 5—6 ГЭС агульнай магутнасцю 50—60 МВт. Аб гэтым паведаміў першы намеснік генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання Аляксандр Сівак на Беларуска-літоўскім эканамічным форуме ў Мінску.

Ён адзначыў, што ў краіне ўжо пачалася рэалізацыя праектаў па стварэнні каскадаў ГЭС на рацэ Нёман (2 электрастанцыі сумарнай магутнасцю 40 МВт) і на Заходняй Дзвіне (4 электрастанцыі агульнай магутнасцю 140 МВт). Так, пачата будаўніцтва Гродзенскай ГЭС (17 МВт), у гэтым годзе будзе завершана распрацоўка архітэктурнага праекта Полацкай гідраэлектрастанцыі (23 МВт). Аляксандр Сівак падкрэсліў, што развіццё гідраэлектраэнергетыкі — адзін з прыярытэтных напрамкаў у галіне выкарыстання аднаўляемых крыніц энергіі. Пакуль жа ў Беларускай энергасістэме функцыянуюць толькі 22 невялікія ГЭС, сумарная магутнасць якіх не перасягае 10 МВт.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 МАЯ 2008 г.

Колькі чакаць кватэру?

На ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на канец 2007 года знаходзілася 717,5 тыс. грамадзян — на 94,4 тыс. больш, чым у канцы 2006 года. Такія звесткі апублікавала Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі.

На канец 2007 года 160,5 тыс. грамадзян, або 22%, знаходзіліся на ўліку 10 гадоў і больш; 149 тыс., або 21%, — пражывалі ў інтэрнатах; 19,3 тыс., або 3%, — у кватэрах, занятых некалькімі наймальнікамі; 2,2 тыс., або 0,3%, — у дамах, што прызнаны непрыдатнымі для пражывання. З агульнай колькасці тых, хто знаходзіцца на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, — 337,5 тыс. маладых сямей (47%), 17,5 тыс. шматдзетных сямей (2,4%), 19,6 тыс. грамадзян, якія маюць права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання (2,7%).

У 2007 годзе атрымалі жыллё і палепшылі жыллёвыя ўмовы 38,5 тыс. чалавек, або 6,2% ад колькасці грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Паказчыкам інтэнсіўнасці вырашэння жыллёвай праблемы з'яўляецца сярэдні час знаходжання грамадзян на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў. Калі ў 1990 годзе пры тагачасных тэмпах будаўніцтва сярэдні час знаходжання сямей на ўліку ў цэлым па краіне складаў 7,5 года, то ў 1995 годзе — 19,5 года, у 2005 годзе — 18 гадоў, у 2006 годзе — 18,3 года, у 2007 годзе — 18,6 года.

Марына НОСАВА.

У «запрэжку» вецер і рэкі

Да 2015 года агульная магутнасць ветраўстановак у Беларусі будзе складаць не менш за 300—400 МВт.

Пра гэта заявіў на беларуска-літоўскім эканамічным форуме першы намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага вытворчага аб'яднання "Белэнерга" Аляксандр Сівак.

Паводле яго слоў, распрацавана праграма па развіцці ветраэнергетыкі. Вядзецца праектаванне першай у краіне ветраўстаноўкі ў Гродзенскай вобласці магутнасцю 1,5 МВт.

А.Сівак таксама праінфармаваў удзельнікаў форуму аб тым, што адным з прыярытэтных кірункаў у галіне выкарыстання аднаўляемых крыніц энергіі ў Беларусі з'яўляецца развіццё гідраэлектраэнергетыкі. Усяго ў айчыннай энергасістэме функцыянуюць 22 невялікія ГЭС, сумарная магутнасць якіх не перавышае 10 МВт.

Бизнес уходит за «бугор»

Как сообщил "Е" первый заместитель начальника Департамента по гражданству и миграции МВД Алексей БЕГУН, основные пути иммиграции белорусского бизнеса проходят через соседние страны. Наибольшее число совместных предприятий зафиксировано в России и Украине. Далее по популярности следуют Польша и Литва, которые предоставляют определенные льготы для привлечения частного капитала, в том числе из Беларуси.

Так, например, в Польше можно, не регистрируясь, до 180 дней вести предпринимательскую деятельность, а сделки между предпринимателями на сумму менее 15 тыс. евро не обязательно проводить через банк. Кроме того, для привлечения малого бизнеса в строительство Варшава готова предоставлять специальные условия. Все это способствует миграции частного капитала из Беларуси в страны Евросоюза. По словам А.Бегуна, нужно принимать в расчет и тот факт, что в США из Беларуси ежегодно выезжают жить до 1000 человек, многие из которых являются представителями бизнеса.

Впрочем, точных данных о миграции бизнеса в соседние страны у Департамента по гражданству и миграции нет. По мнению экспертов, на сегодня даже в области легальной миграции отсутствует адекватная система оценки этого процесса. Можно отслеживать лишь основные направления, не вдаваясь в тонкости самого процесса. И если миграция из Украины и Молдовы имеет тенденции движения на Запад, то миграция из Беларуси остается в своем большинстве ориентированной внутри СНГ. Учитывая то, что белорусы не считаются иностранными гражданами на территории Российской Федерации, подсчитать, сколько из них начало там свой бизнес, практически невозможно. Есть лишь приблизительные данные по трудовой миграции, которая в основном имеет сезонный характер. По мнению А.Бегуна, сезонная трудовая миграция белорусов в Россию составляет около 100 тысяч человек.

Между тем благодаря наличию границы между Россией и другими странами СНГ те получают от миграционных процессов солидные дивиденды. По данным Всемирного банка, в 2006 году только учтенные переводы из-за рубежа составили в Молдове и Таджикистане более 36% ВВП, в Кыргызстане — более 27%, в Армении — почти 20% ВВП.

По данным Министерства статистики и анализа, в 2007 году в Беларусь на ПМЖ прибыли 14 тыс. человек, в том числе из стран СНГ и Балтии — более 12,5 тыс. человек. За то же время страну покинули около 9,5 тыс. белорусских граждан. Таким образом, миграционный прирост населения страны в прошлом году составил 4,5 тыс. человек, что на 1 тыс. меньше, чем в 2006 году.

В 2008 году белорусские власти ожидают увеличения бизнес-миграции в Польшу. Этому будет способствовать введение западной соседкой "карты поляка". Правда, директор Центральноевропейского исследовательского форума по миграции и народонаселению доктор наук Марек КУПИЖЕВСКИ считает, что это не повлияет на бизнес-миграцию, так как права на проживание в Польше такой документ не дает. В то же время, по его мнению, карта будет способствовать повышению трудовой миграции лиц польской национальности.

Александр ОАКЛИ.
www.ej.by

«Бюджет должен сохранить социальную направленность», но «полностью надеяться на бюджет не следует»

Бюджет Беларуси 2009 года должен сохранить социальную направленность. Об этом заявил премьер-министр Сергей Сидорский на заседании президиума Совета министров, на котором рассматривался проект основных направлений бюджетно-налоговой политики Беларуси на 2009 год и на период до 2010 года.

"Бюджет 2009 года должен быть социально ориентированным. Финансирование по статьям поддержки пенсионеров, инвалидов, участников всех войн, программ поддержки детей, материнства, развития здравоохранения должно быть на уровне не ниже параметров 2008 года", — отметил глава правительства.

С этой целью планируется минимизировать отдельные расходы бюджета. "Часть средств должна зарабатываться министерствами и ведомствами самостоятельно. Полностью надеяться на бюджет не следует", — подчеркнул премьер-министр.

Вот так-то! "Бюджет должен сохранить социальную направленность", но "полностью надеяться на бюджет не следует".

Суть разговора на президиуме Совмина изложена на сайте правительства. Из него узнаем, что поставлена задача не снижать темпы экономического развития на ближайшие годы. В связи с этим Министерству экономики дано задание заложить прогнозные параметры до 2011 года, значительно превышающие нынешний уровень. Также поставлена задача выйти на повышенный показатель средней заработной платы в стране — не ниже 700 долларов в эквиваленте к концу 2010 года.

Как подчеркнул первый заместитель министра финансов Андрей Харковец, финансирование дефицита республиканского бюджета планируется осуществить за счет внешних и внутренних государственных заимствований. По его мнению, принимаемые меры по снижению налоговой нагрузки на экономику в 2009—2010 годах обеспечат дополнительный прирост ВВП Беларуси на уровне 1,5%.

Андрей Харковец сообщил, что в 2009—2010 годах будет продолжено упрощение налоговой системы и снижение налогового бремени на экономику. В частности, в 2009 году предполагается снижение ставки сбора в республиканский фонд поддержки производителей сельскохозяйственной продукции, продовольствия и аграрной науки до 1% от выручки, полученной от реализации товаров. Также планируется установить единые ставки местного налога с продаж товаров в розничной торговле и местного налога на услуги в размере 5%. Кроме этого, из объектов обложения налогом на недвижимость предполагается исключить активную часть основных производственных фондов. Распространяться налог будет только на объекты недвижимого имущества. Помимо этого, планируется совершенствование порядка и условий применения подоходного налога с физических лиц, его упрощение. Предполагается перейти на единую ставку подоходного налога на уровне 12%.

В 2010 году планируется отменить сбор в республиканский фонд поддержки производителей сельскохозяйственной продукции продовольствия и аграрной науки, а также отменить местные целевые сборы из прибыли, взимаемые по ставке 3%. Такие меры позволят снизить налоговую нагрузку в 2010 году еще на 1,2 процентного пункта к ВВП.

В соответствии с Программой социально-экономического развития Беларуси на 2006—2010 годы налоговую нагрузку к 2011 году планируется снизить на 3-4 процентных пункта к ВВП.

Фактически же налоговая нагрузка снизится с 30,9% в 2006 году до 24,8% в 2010 году, или на 6 процентных пунктов, отметил первый заместитель министра финансов.

Среднемесячная заработная плата в Беларуси к концу 2009 года может составить 550 долларов в эквиваленте, сообщил первый заместитель министра финансов Беларуси Андрей Харковец.

Планируется, что к концу 2010 года заработная плата возрастет до 700 долларов в эквиваленте. Одновременно будет обеспечен соответствующий рост социальных трансфертов населению (бюджетных пенсий, стипендий, государственных пособий).

По словам Андрея Харковца, бюджет 2009 года сохранит сложившуюся структуру доходов и обеспечит необходимую финансовую поддержку для осуществления госрасходов. Кроме роста заработной платы в бюджетной сфере основным направлением в области расходов в ближайшие годы станет жесткая позиция в отношении содержания бюджетных организаций, а также корректировка форм государственной поддержки реального сектора экономики. В частности, Минфин считает необходимым сократить прямую господдержку предприятий из бюджета в форме финансовой помощи, бюджетных ссуд и займов в пользу косвенной господдержки в виде льготирования процентов по кредитам.

Планы хорошие, но какая их ждет судьба?

Подготовил к печати Сергей ИВАНОВ.

На склад!

У студзені—красавіку 2008 года запасы цукру-пяску на беларускіх прадпрыемствах у 6,7 раза перавысілі сярэднямесячны аб'ём яго вытворчасці, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Запасы кансерваў на 1 мая 2008 года склалі 164,7% сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці і ў параўнанні з пачаткам года паменшыліся на 6,6%. Больш за ўсё на складах назапашана плодаагароднінных кансерваў (50 млн умоўных банак), што ў 2,9 раза перавышае сярэднямесячны аб'ём вытворчасці.

Наталля КАРОТКАЯ.

ГОВОРЯТ

Хотели бы уехать

Опросы показывают, что около 70% молодых людей до 25 лет хотели бы уехать из страны. Правительства стран ЕС и США, ставя визовый шлагбаум, по сути дела спасают Беларусь от демографической катастрофы. Если бы уехали все, кто хочет, через 5 лет работать в стране было бы некому.

В стране острая нехватка квалифицированных руководителей среднего и высшего звена. Одна из причин — большой отток квалифицированных руководителей в соседние страны. В основном в Россию. Специалисты говорят, что для российского бизнеса наши руководители являются ценным капиталом с точки зрения высоких амбиций, умения работать в жестких административных условиях. Кроме того, у них нет столь завышенных претензий по заработной плате, как, например, у москвичей и петербуржцев.

У малого бизнеса будет свой банк

В ближайшее время в Минске начнет свою работу банк для малого бизнеса, сообщил на пресс-конференции заместитель председателя правления Национального банка Василий Матюшевский.

"Учредители предоставили в Национальный банк 90% документов, требуемых для регистрации банка. Сейчас идет формирование персонала банка и дорабатывается пакет документов. В ближайшее время банк начнет работать. Он будет называться ЗАО "Белорусский банк малого бизнеса" (ББМБ)".

Банк планирует предоставлять кредиты в размере от 100 долларов до 200 тыс. долларов, микрокредиты до 10 тыс. долларов для индивидуальных предпринимателей, микро-, малых и средних предприятий. Предполагается, что микрокредиты будут выдаваться без залогов.

Дмитрий ЕРМАК.

МНЕНИЯ

Что делать с чеками «Имущество»?

Белорусская чековая приватизация тянется годы, но на руках населения большое количество чеков. Люди не знают, что с ними делать, так как акции предприятий, на которые можно их обменять, граждан не устраивают.

Мы поинтересовались, что люди думают по этому поводу, как они распорядились своими чеками. Вот что они ответили.

Надежда Гусевич, экономист, Минский р-н:

— Еще до введения моратория я успела перевести чеки "Имущество" в чеки "Жилье" и использовала их на приватизацию квартиры.

Александр Ленев, мастер по ремонту телевизоров, г. Минск:

— Жду постановление правительства о выплате компенсаций за неиспользованные чеки. А может, дадут нам возможность использовать их при покупке товаров? Но пока ничего не слышно.

Олег Никитин, менеджер, г.Минск:

— Чеки лежат дома, жду часа "Х". ОАО, акции которых можно приобрести за них, меня не устраивают, так что — подожду.

Николай Чернец, финансист, г.Минск:

— Вложил их в фонд (СИФ) для покупки акций ОАО "Недвижимость и финансы". Сейчас это все ликвидировано, и я пытаюсь вернуть их назад. Думаю, рано или поздно, но в Беларуси все же будут реализовываться чеки по рыночной цене.

Ольга Линевич, дворник, г.Минск:

— Лет пять назад продала чеки одному частнику по очень низкой цене и сейчас об этом не жалею. Сегодня ими никто не интересуется и не покупает даже за копейки...

Вера Дубовец, доярка, Россонский р-н.:

— Лежат без движения дома. Что с ними делать — ума не приложу, скорее всего выброшу. Вы говорите, что скоро их можно будет продать по хорошей цене? Сомневаюсь...

Алла Тупаева, дворник, г.Минск:

— Чеки отнесла на строительство православного храма, который строится возле моего дома. Их приняли, пусть это будет хоть маленькая частица моих пожертвований Богу...

Опрос провела Галина ЕФИМОВА.

Импортным сокам — заслон

Импорт фруктовых и овощных соков, по данным таможенной статистики, в январе—марте 2008 года вырос на 12,4% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года и составил 13,474 тыс. тонн (13,937 млн долларов). Однако совсем скоро зарубежные соки могут быть потеснены продукцией местных производителей.

Основным поставщиком соков в Беларусь сейчас является Россия. Оттуда ввезено 6,409 тыс. тонн на сумму 6,874 млн долларов. Из Украины импортировано 3,996 тыс. тонн на 2,874 млн долларов.

"Свое присутствие на белорусском рынке российские производители фруктовых соков активно наращивают благодаря отсутствию серьезных отечественных производителей", — приводит агентство ПРАЙМ-ТАСС мнение эксперта рынка напитков. Недавний ввод в Бобруйске предприятия по производству соков усилит конкуренцию и вызовет перераспределение рынка, что может в перспективе привести к вводу ограничительных мер на импорт сока, полагает он.

"В Беларуси сложилась такая ситуация, что 70% соков импортируется из других стран. Мы планируем стать производителем соков № 1 на белорусском рынке и заместить импорт", — рассказал о планах на пресс-конференции по случаю открытия завода в Бобруйске член совета директоров инвестиционной компании Detroit Investments Евгений Кашпер.

К слову, посещая Беловежскую пущу, Александр Лукашенко поставил задачу обеспечить население соком собственного производства. Для этого он распорядился рассмотреть вопрос закупки у населения яблок и при необходимости приобрести линии по производству соков. "Зачем нам продавать за бесценок эту продукцию, а затем ввозить импортный сок, если мы можем организовать собственное производство", — сказал Лукашенко, поручив Белкоопсоюзу и правительству держать под контролем решение этих вопросов.

Дмитрий ЕРМАК.

Когда на пенсию?

В Министерстве труда и социальной защиты Республики Беларусь считают необходимым увеличить возрастную границу выхода на пенсию. Правда, по словам начальника отдела развития пенсионной системы Минтруда Татьяны ПОГОНЫШЕВОЙ, пока дальше, чем высказывания мнений экспертами, вопрос не движется.

В первые дни начались потери наших парней. Погиб заместитель Керкинской ДШМГ С.Д.Махлиновский, потом еще несколько солдат. Было принято решение взять в блокаду это ущелье. Блокада длилась месяц. В результате неудачно проведенной операции Самиалло с остатками своей группы ушел выше в горы. Позже стало известно, что Самиалло снова стал жить в родном Даргаке. Иногда его беспокоили наши минометчики. За ним долго охотились, но так и не смогли уничтожить.

В начале 1990 года, после вывода войск, Самиалло и других местных полевых командиров начали активно давить "ваххабиты". Бывало, что они просили помощи у пограничников. Потом эти группировки вступали в перемирие. Несмотря на острые межплеменные разногласия и вражду, они без колебания могли объединяться в единый фронт. Но мы тогда не знали всех этих тонкостей, реалий, да и просто культуры и истории афганского народа.

После вывода войск пограничники снова стали угрозой для их бизнеса и власти. Они вели обстрел наших застав, осуществляли засады, провозили наркотики, оружие. По-прежнему погибали пограничники, но уже на территории Таджикистана.

Дезертиров среди пограничников не было

За десять лет войны через Афганистан прошло более 62 тысяч пограничников. За эти годы группировкой пограничных войск на территории Афганистана проведено 1113 операций, их них 340 плановых и 773 частные. Погибло 576 пограничников и военнослужащих органов КГБ СССР, раненые и контуженные составили 2540 человек.

При этом ни одного случая дезертирства и пленения пограничников зафиксировано не было. Двадцать две тысячи пограничников награждены орденами и медалями, 7 человек удостоены звания Героя Советского Союза (из них двое — майор Александр Богданов и подполковник Валерий Ухабов — посмертно). Полковник Фарит Шагалеев первым в погранвойсках начал высаживать десант на высоту свыше 3,5 тысячи метров, в том числе ночью. Его коллега майор Валерий Попков вытащил буквально с того света товарищей — экипаж сбитого вертолета. Остальные герои — это воины пограничных десантно-штурмовых подразделений: Иван Барсуков (начальник ДШМГ ОВГ Восточного ПО), Николай Лукашов (начштаба Керкинской ДШМГ), Виктор Капшук (командир боевой группы Керкинской ДШМГ). На протяжении почти 10-летней афганской войны лично командовал и принимал участие в боевых операциях начальник погранвойск, Герой Советского Союза генерал армии В.А.Матросов. Также начальник Хорогского пограничного отряда К.В.Тоцкий лично участвовал во многих операциях в Афганистане. Позже он стал руководителем Федеральной службы пограничных войск России.

Я просмотрел ряд сайтов, книг, очерков, но так и не нашел конкретных цифр, сколько солдат воевало в Афганистане не только из числа пограничников, но и в целом, сколько раненых, умерших после войны. Пришел к выводу, что ни коммунистическая, ни теперешняя власть этим вопросом не занималась. Но все же подведены некоторые итоги из той информации, что я нашел на сайтах.

Так, официальный сайт Бобруйского исполкома указывает, что в Афганистане служило 28.832 белоруса. Согласно информации директора "Минсктранса", в 2007 году в Беларуси проживала 21 тысяча участников войны в Афганистане, т.е за девятнадцать лет после войны умерло 7832 участника войны. Но есть и другая цифра умерших после войны солдат и офицеров — 9500 человек, озвученная председателем ОО "Белорусский союз ветеранов войны в Афганистане" В.Тоестевым в 2006 году.

Так все же сколько нас, "афганцев", погибло в войну и после войны? В любом случае на эти цифры должно обратить внимание государство и дать ответ, почему из жизни ушло столько ребят. К сожалению, пока на этот вопрос власть не отвечает. Вместо того чтобы помочь заслуженным ветеранам войны, она ограничила их в социальных гарантиях, хотя, установленные правительством СССР, они являлись бессрочными. Зато Лукашенко выделил сто миллионов долларов на поддержание хоккейных клубов.

Надо было не ограничивать нас в правах, а, наоборот признать нас участниками войны, ведь об этом ведутся разговоры с 1993 года. Очень хорошо по этому поводу высказался известный генерал-майор в отставке Александр Солдатенко: *"...Эти воины вполне законно считают себя ущемленными в правах по сравнению с участниками Великой Отечественной войны, хотя, по правде говоря, разница между ними только в том, что ранили и убивали этих солдат и офицеров более совершенным оружием. Воины-интернационалисты — это те же участники войны, а не какие-то "приравненные". Именно эти воины должны принять у героев Великой Отечественной эстафету героико-воспитательной работы в стране..."* Хочется сказать этому уважаемому генералу простое солдатское спасибо за то, что не побоялся и открыто высказался в защиту тех солдат и офицеров, которые с честью выполнили свой долг в Афганистане.

Мне не довелось воевать всю службу. Во время Муштивской операции я заболел тяжелой формой инфекционного заболевания и был отправлен в госпиталь. В вертолете летел вместе с погибшим Николаем Савоненко (украинец) и ранеными ребятами. Я понял: вот он — конец жизни для этого человека. Не будет у его матери внуков. Интересно, расскажут ли ей всю правду о подвиге сына? А если б его не убили, ведь он кем-то бы стал, что-то творил, созидал да и просто жил полноценной жизнью.

Такие мысли были и у командира батальона Волошина в повести Василя Быкова "Мой батальон". Главный герой жалел своих солдат и сопротивлялся, когда генералы отдавали непродуманные приказы, которые вели к бессмысленной гибели солдат его батальона, поскольку он знал, что самое ценное на войне — жизнь человека.

Афганская война продолжается...

Эта война была полигоном испытания оружия в противостоянии между Западом, США и СССР. Фактически это была вторая холодная война между капиталистическим и коммунистическим миром. Ввод Советской армии на территорию Афганистана США и Запад восприняли как агрессию против суверенного государства. Политику СССР осудили не только демократические страны, но и конференция исламских стран. Исламская партия Афганистана, Исламское общество Афганистана, Исламский Союз освобождения Афганистана и ряд других партий и движений стали активно противостоять советским войскам. Они ставили своей основной целью свержение афганского правительства и установление исламского режима. Образовался почти единый фронт западных держав и государств третьего мира, в том числе арабских и мусульманских, против размещения советских войск в Афганистане.

Все, что создавалось нового из вооружения, поступало к душманам для проверки в боевых условиях. Советская экономика работала на производство нового вооружения, которое шло на испытание в Афганистан. Заложниками этой авантюры коммунистического режима стали мы, солдаты, противостоявшие всей этой мощи сверхдержав мира.

В таких условиях СССР не мог долго пребывать в Афганистане. Ресурсы истекали, потери людей увеличивались, а перспектив стабильности не было. Война приблизила СССР к глубочайшему экономическому и политическому кризису и как следствие — к распаду Союза и краху коммунистического режима. К сожалению, кровопролитие в стране продолжается.

Афганская проблема актуальна и сейчас, поскольку затрагивает интересы не только жителей этой страны, России, стран СНГ, но и в целом всего мира. Мир в этой стране возможен, и важнейшую роль в разрешении этого конфликта должны играть международные организации, в том числе ООН, а поэтому повышение роли этой международной организации в регионе, несомненно, будет весьма плодотворным для разрешения афганского кризиса.

Афганская война была по существу первой крупной антитеррористической войной новейшей истории. Именно она определила направление развития форм и способов противоборства между воюющими сторонами. Сразу после Афганистана много говорили об опыте афганской войны, но мало делали, чтобы им рационально воспользоваться. Хотя практически все нынешние военные конфликты идут по тем сценариям.

Я знаком со многими замечательными людьми, прошедшими Афганистан. Каждый из них уже стал историей нашей страны. Афганистан — хорошая школа жизни, но лучше жизнь познавать без войны.

Олег ВОЛЧЕК,
участник войны в Афганистане,
член организационного комитета по созданию независимого движения ветеранов боевых действий.

Марыя Шарапава прыедзе ў Чарнобыльскую зону

Візіт вядомай тэнісісткі ў забруджаныя пасля аварыі на ЧАЭС раёны адбудзецца ў канцы лета — пачатку восені.

У мінулым годзе Шарапава ахвяравала 100 тысяч долараў на ажыццяўленне некалькіх праектаў для моладзі ў сельскіх раёнах Беларусі, Украіны і Расіі, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

Ахвяраваныя Шарапавай сродкі прызначаліся для фінансавання праектаў у галіне камп'ютэрнай і экалагічнай пісьменнасці і аднаўлення спартыўных аб'ектаў і бальніц. У верасні мінулага года Шарапава дадаткова пералічыла 30 тысяч долараў на дабрачынныя праекты, якія рэалізуюцца ў Брагінскім і Чачэрскім раёнах Беларусі. Мяркуецца, што адна з мэт візіту Шарапавай — праверка мэтазгоднасці выдзеленых сродкаў.

Мядзведзям спадабалася Віцебшчына

У Віцебскай вобласці пашыраецца зона рассялення бурага мядзведзя. Пра гэта "Інтэрфаксу" паведамілі ў Дзяржаўнай прыродаахоўнай установе "Бярэзінскі біясферны запаведнік".

Яшчэ некалькі гадоў таму ў Віцебскай вобласці, дзе ў Беларусі жыве асноўная колькасць гэтых жывёл, было 4 міні-папуляцыі — бярэзінская, бабіновіцкая, суражская і паўночная. Зараз бурыя мядзведзі ёсць ва ўсіх лясгасах вобласці. Паводле папярэдніх падлікаў, у Віцебскай вобласці жыве не менш за 150 асобін.

Па звестках навукоўцаў, вышыня самага вялікага мядзведзя, які жыве ў Віцебскай вобласці, не меней за 2 метры, калі ён стане на заднія лапы. Вага самых буйных асобін можа дасягаць 250 кг. У сярэднім дарослыя беларускія бурыя мядзведзі важаць 130—170 кг.

Пры гэтым у Беларусі наўрад ці дазволяць паляванне на гэтую жывёлу. Буры мядзведзь занесены ў Чырвоную Кнігу Беларусі.

ДЗІКУНСТВА

Пабудавалі дом на... магільных плітах

Надмагільныя пліты са старых могілак знойдзены ў падмурку аднаго з прыватных жылых дамоў у Баранавічах.

Як паведаміла БелаПАН старшыня яўрэйскай абшчыны Баранавічаў Раіса Гальштэйн, драўляны дом па вуліцы Лазо шмат гадоў прастаяў на падмурку з надмагільных пліт, што былі ўзяты на старых яўрэйскіх могілках у пасляваенныя гады. Новы ўладальнік разабраў яго, каб пабудаваць на гэтым месцы іншы будынак, і знайшоў надмагільныя пліты з надпісамі на ідыш.

"З падмурка выцягнута восем цэлых надмагільных пліт з чырвонага і чорнага граніту і шмат кавалкаў ад разбітых помнікаў, — сказала Р.Гальштэйн. — На адным з помнікаў бачна дата — 1927 год".

Паводле меркавання мясцовых гісторыкаў, гэта надмагільныя пліты са старых яўрэйскіх могілак, разбураных адразу пасля вайны. Старажылы лічаць, што не адзін дом на вуліцах, якія прылягаюць да тэрыторыі былых яўрэйскіх могілак, стаіць на такім падмурку. Адміністрацыя яўрэйскай абшчыны Баранавічаў просіць мясцовыя ўлады дазволіць устанавіць надмагільныя пліты на тэрыторыі Мемарыяла ахвярам Халакоста па вуліцы Чарнышэўскага — на месцы былых яўрэйскіх могілак.

Галіна ЗАГАДСКАЯ.

ЗДАРЭННЕ

У Беларусі не так спакойна, як падаецца

У Кобрыне ўчынены разбойны напад на двух грамадзян Расіі, у выніку якога адзін з іх загінуў.

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Брэсцкай вобласці, 25 мая ў кватэры жыхаркі райцэнтра быў знойдзены труп жыхара Паўночнай Асеціі 1963 года нараджэння. Загінуўшы быў звязаны, рот і нос — заклеены скотчам. Звязаным тут быў яшчэ адзін мужчына, таксама жыхар Паўночнай Асеціі.

Па гэтым факце пракуратурай Кобрынскага раёна распачата крымінальная справа па ч.3. арт. 207 (разбой) і ч.2 п.12 арт. 139 (забойства) Крымінальнага кодэкса.

Устаноўлена, што вечарам 24 мая ў кватэру ўварваліся трое невядомых у масках, звязалі расіян і забралі ў іх значную суму грошай у доларах ЗША. Як мяркуецца, прычына смерці мужчыны — асфіксія. Паводле інфармацыі, грамадзяне Расіі прыбылі ў рэгіён для набыцця аўтамабіля. Праводзіцца расследаванне.

КІНАСЕАНС

Страшылка для нявартых бацькоў

Са змрочнымі тварамі пакідалі гледачы залу, дзе дэманстраваўся хранікальны відэафільм пра выхаванцаў дзіцячага дома.

Прагляд стужкі, знятай журналістамі Віцебскай студыі тэлебачання па замове праваахоўных структур, быў наладжаны з ініцыятывы Інспекцыі па справах непаўналетніх Кастрычніцкага РАУС Віцебска, а гледачы ў залу былі дастаўлены ў дабравольна-прымусовым парадку, паводле запрашэнняў участковых інспектараў міліцыі.

Незвычайная культурна-выхаваўчая акцыя мела сваёй мэтай нагадаць бацькам, у якіх часова аднялі дзяцей, што іх нашчадкам лепш было б жыць дома, у сям'і, а не ў спецыяльных дзяржаўных установах — прытулках для сірот.

Цяпер у Цэнтральным, Кастрычніцкім раёнах Віцебска налічваецца каля 190 бацькоў, з якіх працуе толькі 120. Напрыканцы сеанса намеснік начальніка РАУС маёр міліцыі А.Каліноўскі нагадаў гледачам Дэкрэт прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №18 "Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей з неўпарадкаваных сем'яў" і папярэдзіў, што ўсім, хто часова разлучаны з дзецьмі, хочаш не хочаш, а давядзецца "змяніць бутэльку на карысную працу".

Акрамя дарослых, якія глядзелі фільм у суровым маўчанні, на прагляд стужкі прывялі школьнікаў раёна, што знаходзяцца на ўліку ў раённай інспекцыі па справах непаўналетніх. Гэтая частка залы паводзіла сябе нязмушана, раз-пораз нават весялілася ад убачанага. У адрозненне ад прысутных дарослых, падлеткі яшчэ не ўсведамляюць, што такое адказнасць за дзяцей і якую ролю ў сямейных узаемаадносінах можа адыгрываць дзяржава. Гэтыя гледачы проста былі задаволены паказам бясплатнага "кіно".

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 МАЯ 2008 г.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

Ілля КУБЛІЦКІ:

«Помніце гісторыю сваёй краіны...»

На пытанні «Народнай волі» адказвае лютніст гурта «Стары Ольса» Ілля Кубліцкі.

— Лідэр гурта "Стары Ольса" Зміцер Сасноўскі называе цябе віртуозам і лепшым лютністам Беларусі. Ты з гэтым згодны?

— Не, я так не думаю. Ведаеце, па-першае, у нас не так шмат лютністаў, каб мяне выдзяляць, а па-другое, гэты рух толькі пачынаецца ў Беларусі. Дарэчы, мала ў каго яшчэ ёсць інструменты. Таму не трэба перабольшваць, я толькі пачынаючы лютніст.

— Ты граеш толькі на лютні?

— Я скончыў кансерваторыю па класе класічнай гітары, і таму першым маім інструментам была менавіта яна, а ўжо ў "Старым Ольсе" я пачаў іграць на лютні, цытры і колавай ліры.

— Якія напрамкі музыкі табе больш падабаліся ў юнацкія гады?

— Я граў і слухаў, як і зараз, толькі класіку. І раю ўсім музыкам для натхнення слухаць класічную музыку. Толькі на яе глебе можна пачаць нешта пісаць самому.

— Ты размаўляеш толькі на беларускай мове: гэта прафесійная неабходнасць ці плённае захапленне?

— Я люблю беларускую мову, і пры сустрэчы з сябрамі мы сапраўды размаўляем толькі па-беларуску. Але, на жаль, у большасці выпадкаў людзі не разумеюць і не валодаюць мовай. Нават выкладаць (я працую яшчэ ў музычнай школе) мне даводзіцца таксама па-руску, таму што шмат часу затрачваецца не на вывучэнне інструмента, а на тлумачэнне і пераклад маіх слоў.

— Чым яшчэ, акрамя музыкі, ты мог бы зарабляць на жыццё?

— У юнацтве я паступіў у Тэхналагічны універсітэт, але нічога добрага з гэтага не выйшла: вельмі хутка зразумеў, што не маё, таму забраў дакументы і паступіў у музычнае вучылішча, а потым — у кансерваторыю. Наогул, музыкай зарабляць грошы прыемна. Музыка для мяне — гэта не толькі прафесія, гэта маё жыццё. І я ніколі яе не змяняю ні на што іншае.

— Дзе ты нарадзіўся?

— У Мінску.

— Раскажы пра сваё першае каханне і першы пацалунак?

— Гэта было так даўно, што я ўжо і не памятаю (збянтэжана), дзесьці ў школе, мабыць, у класе 5—6-м. Але давайце не будзем аб гэтым, мне здаецца, гэта нікому не цікава.

— Сямейнае становішча?

— Ужо год як ажаніўся, але дзяцей пакуль няма.

— Як з жонкай пазнаёміліся?

— Пазнаёміліся мы з Маргарытай на прэзентацыі альбома "Шлях", куды яе запрасіў лідэр наша гурта, каб паразважаць над ідэяй стварэння тэатра "Яварына". Потым яна стала кіраўніком гэтага тэатра. Зараз разам ездзім па фестывалях.



— У цябе, напэўна, ёсць прыхільніцы. Жонка не раўнуе?

— У мяне на флірт не хапае часу. Мабыць, я вельмі сур'ёзны чалавек, каб губляць жыццё на нейкія гулянкі — шкада часу. Тым больш што зараз ідзе праца над новым альбомам і наогул шмат планаў, ды і не папсовая я зорка, каб у мяне было шмат прыхільніц, якія мне б дакучалі.

— Зміцер Сасноўскі ў адным са сваіх інтэрв'ю сказаў, што для яго секс-сімвалам беларускай эстрады з'яўляецца "босая і бялявая Аляксандра" з дуэта "Аляксандра і Канстанцін". А каго ты лічыш секс-сімвалам беларускай эстрады?

— На мой погляд, параўноўваючы з Захадам, Беларусь яшчэ не дарасла да ўзроўню, на якім можна было размаўляць пра шоу-бізнес, секс-сімвалы і прафесійную эстраду. У нас няма такога руху, які адбываецца на Захадзе. Ды і наогул, для мяне на першы план выходзіць прафесійнасць, а не знешнія даныя. Чалавек можа быць прыгожым, але не працаваць над сваёй творчасцю. Беларускіх выканаўцаў я мог слухаць, калі мне было год 18, а зараз перарос. Акрамя класікі, слухаю толькі замежную музыку, бо ўзровень беларускай музыкі на сённяшні дзень значна слабейшы.

— Гурт "Стары Ольса" мае намер паспрабаваць свае сілы на "Еўрабачанні"?

— Не, на Еўрабачанне мы не паедзем, бо гэта эстрадны конкурс, а мы робім чысты фольк, а не фольк-мадэрн: дзякуй богу, яшчэ не апапсовіліся. Нават калі б нам на поўным сур'ёзе прапанавалі гэтую паездку, я адмовіўся б яшчэ і таму, што не бачу ў гэтым ніякага сэнсу. Каб быць папулярным, неабавязкова ездзіць на "Еўрабачанне". Бо калі ты граеш вартую музыку — цябе слухаюць, і наадварот. А паездку на "Еўрабачанне", на мой погляд, можна прапанаваць гурту "Троіца", які грае фольк-мадэрн і грае, да слова сказаць, вельмі добра.

— Вы шмат гастралюеце не толькі па Беларусі, але і па заходнім краінам. Як там ставяцца да вашай музыкі?

— Наша музыка вельмі цікавіць тамашняга слухача, узяць нават той жа "Полацкі сшытак", які так падабаецца на Захадзе. У нас ужо склалася як у Беларусі, так і за яе межамі ўстойлівая аўдыторыя слухачоў. Аматараў нашай музыкі не становіцца менш.

— Чаго не хапае, на твой погляд, беларускай эстрадзе?

— Па-першае, нашым беларускім "зоркам" трэба пазбаўляцца ад фанаграмы, і гэта самае галоўнае. Фанаграма — гэта падман слухачоў. Зразумела, без фанаграмы выжывуць не многія, але застануцца сапраўдныя майстры і прафесіяналы сваёй справы. На Захадзе такога няма, каб людзі плацілі грошы, прыходзілі на сольны канцэрт, а ім ставілі заезджаны дыск.

— Ці існуе, на твой погляд, самабытная беларуская музычная культура?

— Канешне. Нават мала якія краіны могуць пахваліцца такім пластом фальклору, які ёсць у нас. Праз савецкі час, праўда, шмат чаго згубілася, але мы імкнёмся знаходзіць і адраджаць старадаўнія песні.

Наогул, я лічу, што павінна праводзіцца прапаганда беларускай гісторыі, хай і на рускай мове, але на іншым узроўні. Кожны беларус павінен ведаць, што гісторыя яго краіны пачынаецца не з 20—30-х гадоў XX стагоддзя, а з часоў Вялікага княства Літоўскага. Таму хачу ўсім сказаць: помніце гісторыю сваёй краіны, цікаўцеся ёй, любіце сваю Бацькаўшчыну і не забывайце роднай мовы — каб не ўмёрлі...

Марыя МЯЛЁХІНА.
Фотаздымак А.БЕЛАВУСАВА.

ХТО ЁСЦЬ ХТО

"Стары Ольса" — гурт сярэднявечнай беларускай музыкі, які існуе з 1999 года. Стваральнік і кіраўнік — Зміцер Сасноўскі. Гурт аднаўляе гучанне многіх забытых інструментаў і адраджае музычныя традыцыі Вялікага княства Літоўскага.

У рэпертуары — беларускія народныя балады і ваярскія песні, творы беларускіх кампазітараў эпохі Рэнесансу, кампазіцыі з беларускіх зборнікаў прыдворнай музыкі ("Полацкі сшытак", "Віленскі сшытак"), беларускія канты XVI — пачатку XVII стагоддзяў, а таксама еўрапейскія папулярныя мелодыі эпохі сярэднявечча і Рэнесансу.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Павел МАЖЭЙКА:
«У гісторыі не застанецца і следу ад тых людзей, якія аддавалі загады аб знішчэнні горада і закрыцці газет...»

У Беларусі з'явілася першая пазітыўная кніга-манаграфія, прысвечаная аднаму гораду, — "Магдэбургская Гародня". Кнігу напісаў выхадзец з Гародні, доктар гістарычных навук Юрый Гардзееў, а выдалі актывісты ствараемага руху "За Свабоду" пры падтрымцы польскага ўрада.

"Ідэя заснавання выдавецкай серыі "Гарадзенская бібліятэка" ўзнікла ў мінулым годзе, калі адбываліся найбольш значныя і шакіруючыя факты знішчэння ўладамі гістарычных будынкаў у Гародне, — распавядае каардынатар серыі журналіст Павел Мажэйка. — *Мэта серыі — пазітыўная папулярызацыя нашага горада. Мы вырашылі распавесці пра тое, што Гародня — горад з еўрапейскімі дэмакратычнымі традыцыямі, які даў Беларусі і ўсяму свету шмат людзей, якія зрабілі значны ўнёсак у гісторыю, культуру, навуку. Першая кніга серыі "Магдэбургская Гародня" ўяўляе сабой шэраг прац, прысвечаных або напісаных у гэтым слаўным горадзе".*

Выдавецкая серыя "Гарадзенская бібліятэка" прысвячаецца той Гародні, якой беларусы могуць ганарыцца. Яна будзе знаёміць з гісторыяй горада, свабоднай ад хлусні, яе кнігі будуць распавядаць пра людзей, якія ў розныя часы супрацьстаялі разбурэнню і знішчэнню.

"Мне здаецца, што большасць людзей, якія кіруюць сённяй або кіравалі раней Гародняй, будзе мала пазнанай у культуры і гісторыі, — гаворыць Павел Мажэйка. — *Я кажу менавіта пра тых, хто садзейнічаў "забіццю" горада. Наша выданне — спроба паказаць, што ў гісторыі не застанецца і следу ад тых людзей, якія аддавалі загады і рашэнні аб знішчэнні і разбурэнні горада, аб закрыцці газет, аб разгонах дэманстрацый. У памяці застануцца імёны тых, хто складаў і складае слаўнае імя горада... Нягледзячы на ўсялякія разбурэнні, дух горада застаецца жывым..."*

Асноўнымі спонсарамі выдання кнігі выступілі ўрад польскага горада Вроцлаў і Міністэрства замежных спраў Польшчы. Арганізатары выдавецкай серыі не бачаць нічога дзіўнага ў тым, што беларускія праекты фінансуюцца замежнымі краінамі.

"З самага пачатку мы хацелі зрабіць міжнародны праект, — кажа Павел Мажэйка. — *Галоўнай рысай Гародні з'яўляецца яго еўрапейскасць і шматкультурнасць. Мы вызначаем гэта як наш значны плюс і трамплін у будучыню. У нас нават і пытанняў не ўзнікала аб тым, чаму мы робім выданне не з беларусамі, а з палякамі. Нас гэта не бянтэжыла. Мабыць, таму, што мы жывём у некалькіх дзесятках кіламетраў ад мяжы... У планах — супрацоўніцтва таксама з немцамі і чэхамі..."*

Вольга ПРУДНІКАВА.

СЛЫШАЛИ?

Наталье Тамело дали медаль

Солистку Государственного концертного оркестра Республики Беларусь под руководством Михаила Финберга Наталью Тамело наградили медалью "За трудовые заслуги".

Соответствующий указ на днях подписал А.Лукашенко.

— Пока мне еще не вручили медаль, но уже прислали поздравительную телеграмму от министра культуры, в которой также есть поздравление и от президента, — *рассказала Наталья Тамело "Народной воле".* — Меня лично поздравил Михаил Яковлевич Финберг. Конечно, артисту, как и любому человеку, приятно, когда его признают. Безусловно, это ко многому обязывает. Нужно много работать, идти вперед. Почему именно мне вручили эту медаль? Может, это будет и нескромно, но я этого достойна. В Национальном оркестре симфонической и эстрадной музыки я работаю уже около пятнадцати лет. Огромное количество концертов с моим участием, аплодисменты зрителей — это подтверждение моего успеха. Скажем так: выбрали — значит, достойна. Помимо работы в оркестре я еще занимаюсь и сольной деятельностью. Записываю новые песни, снимаю клипы...

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

КСТАТИ

Кроме Натальи Тамело из деятелей культуры аналогичную медаль получили главный художник Купаловского театра **Борис Герлова**н, артистка Национального академического народного хора им.Г.Цитовича **Валентина Крылович**, дирижер Национального театра оперы **Лев Лях**.

ЗАПРАШЭННЕ

Гедрыус КЛІМКЯВІЧУС:

«Нягледзячы на тое, што сёння Літва і Беларусь — розныя дзяржавы, мы павінны быць разам...»

14—17 жніўня 2008 года на тэрыторыі Літвы, у 50 кіламетрах ад мяжы з Беларуссю, будзе праходзіць другі фэст музыкі і мастацтва "Be2gether", які аб'ядноўвае жыхароў дзвюх краін.

"Be2gether" — найбуйнейшы фестываль на тэрыторыі Балтыйскіх краін — упершыню прайшоў 24—26 жніўня 2007 года. Былі абсталяваны клуб і дзве вялікія сцэны, дзе выступілі 32 выканаўцы самых розных стыляў амаль з усяго свету.

Сёлета фестываль абяцае быць яшчэ больш маштабным. *"Be2gether" пачнецца 14 жніўня ў Вільнюсе,* — гаворыць арганізатар фестывалю, літоўскі бізнесмен Гедрыус Клімкявічус. — *Больш за 300 барабаншчыкаў будуць іграць гімн нашага фестывалю на вуліцах Вільнюса. Да гэтага перформансу змогуць далучыцца жыхары горада і госці фэсту. Пасля мы раз'язджаемся па клубах Вільнюса, дзе гуляем да раніцы. А ў шэсць раніцы 15 жніўня адкрыюцца вароты Нарвілішскага замка.*

У гэты раз на трох сцэнах адыграюць каля 70 музыкаў. Мы падабралі такі склад, каб людзі з рознымі музычнымі густамі маглі знайсці для сябе нешта цікавае.

Фестываль будзе прысвечаны не толькі музыцы, але і мастацтву. Будзе многа перформансаў, будуць працаваць воркшопы, пройдуць урокі музыкі і танцаў, будзе нават дыскатэка ў басейне з брудам..."

Асноўная ідэя "Be2gether" - духоўнае ўзаемаўзбагачэнне літоўцаў і беларусаў. *"Шмат гадоў мы былі адной краінай, у нас была адна культура,* — гаворыць Гедрыус Клімкявічус. — *А гадоў 15 таму атрымалася так, што людзі, культура былі раз'яднаныя. Зусім побач ад Нарвілішскага замка праходзіць жалезны плот, які адлучае часам нават сваякоў...*

З дапамогай фэсту мы запрашаем людзей задумацца, зблізіцца. Нягледзячы на тое, што сёння Літва і Беларусь — розныя дзяржавы, мы павінны быць разам. Першы фестываль апраўдаў чаканні — паказаў, што мы можам быць разам. Думаю, другі яшчэ раз гэта дакажа..."

Як і летась, амбасада Літвы ў Беларусі абяцае максімальна аблегчыць для беларусаў атрыманне віз.

"Мы знойдзем такі варыянт, які дазволіць як мага большай колькасці беларусаў прыехаць на фестываль, — гаворыць амбасадар Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас. — *Зробім усё, каб вас не пужалі кошт і доўгія тэрміны атрымання віз. У скорым часе мы абвесцім, як гэта будзе арганізавана".* Не выключана, што беларусы змогуць атрымаць візу на час фестывалю проста адразу з квітком.

"Вы думаеце, чаму мерапрыемства праводзіцца другі раз? — жартуе Эдмінас Багдонас. — *Першы не акупіўся, вось Гедрыус і вырашыў паўтарыць".*

"Любы фэст з першага разу не акупляецца, — адказвае Гедрыус Клімкявічус. — *Для таго, каб мерапрыемства пачало прыносіць нейкую выгаду, патрэбны час. Да таго ж мы не такія багатыя, каб адразу раскруціць любы фэст, як Расія. Або Віцебск".*

Беларусы запрашаюцца на фэст не толькі ў якасці гледачоў.

"Мы жадаем быць бліжэй не толькі ў забавах, але і ў працы, — гаворыць Гедрыус Клімкявічус. — *Таму мы будзем рады беларускім валанцёрам. На нашым фэсце мала паліцыі, асноўную працу выконваюць добраахвотнікі: дапамагаюць гасцям, інфармуюць іх, сустракаюць гурты. Мы запрашаем усіх маладых людзей, якія жадаюць стаць яшчэ бліжэй да нас, прасякнуцца гэтым салодкім словам "together". Уся інфармацыя аб тым, як можна стаць валанцёрам, знаходзіцца на нашым сайце — www.betogether.lt".*

Вольга ПРУДНІКАВА.

ЗЕМЛЯКИ

Гендиректор «Майкрософта» Стив Балмер имеет белорусские корни

Его прадед и дед по материнской линии жили в белорусском городе Пинске.

Стив Балмер является генеральным директором корпорации Microsoft —мирового лидера в производстве программного обеспечения для персонального и делового применения. Стив Балмер присоединился к Microsoft в 1980 году и был первым бизнес-менеджером, принятым на работу Биллом Гейтсом.

Что говорит пинчанам фамилия Балмер? Как пишет пресса, немного... А вот фамилия Дворкины, наоборот, знакома хорошо. Шлома Дворкин, родной дедушка Балмера, начинал свой бизнес с работы в портняжной мастерской, располагавшейся в Молотковичах, что в пригороде Пинска. В годы Первой мировой войны вместе с тысячами беженцев еврейская семья скиталась по просторам Российской империи. На некоторое время полешуки осели в Саратовской губернии. Оттуда часть Дворкиных вернулась в Пинск. Родные дядья Балмера выстроили там пекарню. Другая же часть семейства эмигрировала в Соединенные Штаты. В 1920 году в Детройте родилась мать Стивена Беатрис. Там же и вышла замуж за выходца из Швейцарии Фреда Балмера. В 1956 году на свет появился Стивен, ставший впоследствии ближайшим помощником Билла Гейтса.

АНОНС

«Шалом» ад Артура Клінава

Вядомы беларускі мастак і архітэктар Артур Клінаў напісаў новы раман. Плануецца, што твор "Шалом" выйдзе напрыканцы года на нямецкай і беларускай мовах.

"Шалом" — гэта раман пра мастака з Магілёва, які прыязджае ў Нямеччыну на скульптурны пленэр, — распавёў "Народнай волі" Артур Клінаў. — *На "блашыным" рынку ён знаходзіць кайзераўскі шалом — са шпілем наверсе. Апранае яго на галаву і... вырашае больш ніколі ў жыцці не здымаць. У гэтым шаломе ён вяртаецца на сваю радзіму, і тут пачынаецца сапраўдная гісторыя... Натуральна, што яго жыццё кардынальна мяняецца. Можна сказаць, што гэта бунт лузера супраць усяго свету. Гэта раман-метафара на ўсю Беларусь, бо фактычна Беларусь сёння і ёсць чалавек у шаломе, які шукае свой незразумелы шлях — нешта такое, чаго ўвесь свет зразумець не можа..."*

Артур Клінаў кажа, што яго новы раман можа пабачыць свет ужо напрыканцы года. Прычым адразу на беларускай і нямецкай мовах.

"Ёсць папярэдняя дамоўленасць, што новы раман выйдзе ў кніжнай серыі "Нашай нівы", — кажа Клінаў. — *Якая версія выйдзе хутчэй — нямецкая ці беларуская, пакуль не ведаю".*

Марына КОКТЫШ.

ХТО ЁСЦЬ ХТО

Артур Клінаў нарадзіўся ў 1965 годзе ў Мінску. Скончыў мастацкую школу, архітэктурны факультэт Белдзяржпалітэха. Аўтар арт-праектаў "Смерць піянера", "Тэксты", "Салодкае жыццё" і іншых. Галоўны рэдактар альманаха pARTisan. Дэбютаваў як літаратар у 2007 годзе з "Малой падарожнай кніжкай па Горадзе Сонца".

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 МАЯ 2008 г.

ХАКЕЙ

Стары новы трэнер

На чарговым пасяджэнні выканкама Беларускай федэрацыі хакея стала вядома прозвішча новага галоўнага трэнера зборнай Беларусі. Агучаная інфармацыя не стала сенсацыяй. Як прагназавалі многія, у тым ліку і "Народная воля", на пост галоўнага трэнера нашай каманды было вырашана вярнуць Глена Хэнлана.

З імем гэтага канадскага спецыяліста звязаны адзін з самых гучных поспехаў айчыннага хакея. Пад кіраўніцтвам Хэнлана беларусы сталі шостымі на чэмпіянаце свету. Праз пэўны час Хэнлан сышоў з паста "рулявога" нашай каманды, засяродзіўшыся на працы з клубамі. Сыходзячы, Хэнлан адрэкамендаваў кіраўнікам нашай федэрацыі Курта Фрэйзера. Пад кіраўніцтвам гэтага спецыяліста беларусы, выступаючы на чэмпіянатах свету, выйгравалі толькі па адной гульні.

Самае пікантнае ў сітуацыі з вяртаннем Хэнлана на пост галоўнага трэнера заключалася ў тым, што ў той самы дзень, калі яно адбылося, ужо былы настаўнік зборнай Беларусі Фрэйзер не ведаў аб сваёй адстаўцы. Як паведаміў старшыня Беларускай федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў, які, дарэчы, прыбыў на пасяджэнне хворым на пнеўманію, размова з Фрэйзерам павінна была адбыцца напярэдадні, аднак яе вырашылі перанесці на больш позні тэрмін. Акрамя таго, Навумаў выказаў сваё меркаванне наконт запрашэння Фрэйзера ў зборную: "Не лічу, што запрашэнне Курта было памылкай. Я ўдзячны яму за працу. Можа, у нечым ён памыляўся, але гэта ад вялікага жадання зрабіць каманду лепей. Трэнер Уладзімір Крыкуноў неяк сказаў: "Шмат добрых трэнераў, але павінен быць фарт". Курту яго крыху не хапіла".

Навумаў таксама паведаміў, што ўзначаліць зборную выказвалі жаданне і айчынныя спецыялісты. Прозвішчы жадаючых не агучваліся, але Навумаў лічыць, што беларускія трэнеры пакуль не дацягваюць да патрэбнага ўзроўню, бо ў "іх свядомасці няма таго, што нам па плячы гуляць са Швецыяй, Чэхіяй, Швейцарыяй. Мы ўпершыню выйшлі на той узровень, калі не абмяркоўваецца, які матч трэба выйграць, каб вырашыць тую ці іншую задачу".

Што да наноў прызначанага Хэнлана, то ён будзе сумяшчаць працу ў беларускай зборнай з працай у фінскім клубе "Екірыт".

Па словах кіраўніка беларускай федэрацыі, Хэнлан пагадзіўся трэніраваць беларусаў бясплатна. На плечы федэрацыі кладзецца толькі аплата пералётаў канадскага спецыяліста ў Беларусь і знаходжанне ў нашай краіне яго і ягонай сям'і.

Альтруісту Хэнлану ў працы са зборнай будуць дапамагаць айчынныя спецыялісты — Эдуард Занкавец і Уладзімір Цыплакоў. З'явіўся ў штабе зборнай і новы чалавек — 58-гадовы Уэйн Флемінг.

Са з'яўленнем гэтага канадца ў Беларусі функцыянеры нашай федэрацыі забіваюць двух зайцаў. Акрамя працы ў штабе галоўнай каманды краіны, Флемінг узначаліць мінскае "Дынама", якое ў наступным сезоне возьме старт у расійскай Кантынентальнай хакейнай лізе.

Такім чынам, беларуская федэрацыя хакея па-ранейшаму прытрымліваецца "канадскага вектару". Уэйн Флемінг мае добры паслужны спіс. У свой час ён працаваў са зборнай Канады, якую ў якасці асістэнта галоўнага трэнера прыводзіў да залатых медалёў чэмпіянату свету. На якіх умовах Флемінг будзе працаваць з "Дынама" — пакуль невядома.

Тым часам камплектаванне складу мінскага "Дынама" распачалося. Перамовы з хакеістамі ідуць поўным ходам. Мяркуецца, што "Дынама" стане базавым клубам зборнай Беларусі, таму і гуляць у гэтай камандзе будуць тыя, на каго разлічвае трэнерскі штаб на чале з Гленам Хэнланам.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

P.S *Літаральна перад падпісаннем нумара ў друк распаўсюдзілася інфармацыя аб тым, што канадскі спецыяліст Уэйн Флемінг не даваў згоды ўзначаліць мінскае "Дынама". Пра гэта паведаміў галоўны трэнер зборнай Беларусі Глен Хэнлан.*

Тую самую інфармацыю пацвердзілі і за акіянам. Прадстаўнік па сувязях з грамадскасцю хакейнага клуба "Калгары", дзе працуе Флемінг, Пітэр Хэнлан заявіў, што размаўляў з Флемінгам і той "рашуча адмаўляе факт згоды супрацоўніцтва з беларускім клубам".

Такім чынам, перамовы аб пераходзе ў сталічнае "Дынама" вядуцца з наступнымі хакеістамі:

галкіперы — Віталь Коваль, Зміцер Мільчакоў;

абаронцы — Андрэй Башко, Вадзім Сушко, Ігар Шведаў, Сяргей Коласаў, Віктар Касцючонак, Аляксандр Макрыцкі;

нападаючыя — Яўген Кавыршын, Яраслаў Чупрыс, Канстанцін Кальцоў, Аляксандр Кулакоў, Зміцер Мялешка, Андрэй Міхалёў, Аляксей Угараў, Сяргей Задзялёнаў, Аляксандр Бараўкоў, Сяргей Дзямагін, Андрэй Стась.

ВОКРУГ СПОРТА

Абрамович уволил главного тренера «Челси»

Израильский специалист Авраам Грант уволен с поста главного тренера "Челси".

Он возглавил "Челси" в сентябре прошлого года, сменив на этом посту португальца Жозе Моуриньо. Под его руководством "Челси" занял второе место в чемпионате Англии и проиграл в финале Лиги чемпионов, уступив по пенальти "Манчестер Юнайтед".

Авраам Грант заявил, что разочарован решением руководства "Челси" о его увольнении. "Я принял команду в непростое время. Мы неплохо выступили в этом сезоне. Они решили меня заменить. Я чувствую злость и разочарование, чувствую себя разбитым", — приводит слова бывшего наставника "аристократов" британская газета News of the World.

Игрок-выпивоха

Баскетболист "Чикаго Буля" Йоаким Ноа был арестован за хранение наркотиков и распитие алкоголя на улице.

Полицейский остановил Ноа на улице города Гейнсвиль, штат Флорида, увидев, что в руках более чем двухметровый баскетболист держит пластиковый стакан "с жидкостью янтарного цвета", говорится в полицейском протоколе. Как установила экспертиза, содержимое стакана оказалось спиртным напитком, а, согласно законам города, даже ношение алкоголя в открытой посуде на улицах запрещено.

После того как Ноа был доставлен в полицейский участок, в его кармане при обыске была обнаружена сигарета с марихуаной.

Получив от баскетболиста письменное обещание явиться на суд, полицейские отпустили Ноа. Теперь по обвинению в хранении наркотиков ему грозит до шести месяцев тюрьмы или штраф в размере 500 долларов.

СВЕТСКАЯ ХРОНИКА

Александр Глеб прилетит в Минск за два дня до своей свадьбы

31 мая состоится свадьба лучшего футболиста сборной Беларуси Александра Глеба.

Лучший футболист Беларуси пока еще числится в лондонском "Арсенале", но талантливого игрока уже собираются перекупить другие клубы. Сам же Александр Глеб решился на время отвлечься от дел футбольных и сделать приятное близким — жениться. Чем исполнил давнюю мечту своих родителей.

— Сашка вообще-то все итальянское любит, — откровенничал со мной пару лет назад отец футболиста Павел Григорьевич. — Как накупит туфлей, так мне носить приходится. Та-акой уже модник! Ну любит он этих пчел, что ж поделаешь...

— Каких еще пчел? — уточнял я.

— Девушек! Я ему постоянно говорю: "Выбирай белоруску, если жениться надумаешь". Видел я этих иностранок...

— А у вас какие требования к невестке будут?

— Какие требования? Если ему девушка понравится, то пускай женится. Нам же никто не выбирал. Главное, чтобы в Саше не деньги видела, а человека. Пускай лучше найдет простую девушку, но чтобы она его любила и уважала.

Девушку Александр Глеб и на самом деле нашел простую. Анастасия Косенкова — всего-навсего бывшая белорусская модель, телеведущая и певица. Кстати, следует уточнить, что влюбленная пара расписалась в загсе еще год назад, а теперь решили сделать в ресторанчике банкет для близких.

— Подготовка к свадьбе идет полным ходом, — рассказывает мне накануне торжественного мероприятия мама Александра Глеба Лидия Владимировна. — А сам Саша сейчас со сборной в Германии и прилетит в Минск только за два дня до свадьбы. Хотя, в принципе, уже все приготовлено. Тем более, и не свадьба это будет, а вечер для родственников, который пройдет в узком кругу. Мои из России приедут... Дети решили сделать нам всем вот такой подарок.

Алесь СИВЫЙ.

ШАХМАТЫ

Решите задачу
Н.Бельчиков, В.Жукович

Белые: Крd8, Фа5, Лb1, Сf2, п. с2 (5).

Черные: Крс6, пп. b4, b7, d4 (4).

Мат в 2 хода.



Предлагаем вниманию читателей двухходовую задачу, авторами которой являются известный белорусский проблемист, мастер спорта по шахматной композиции Николай Бельчиков (Борисов) и минчанин, член Союза белорусских писателей Василь Жукович. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: 220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".

Европейский форум в Пловдиве

В болгарском городе Пловдиве прошел очередной чемпионат Европы по шахматам среди мужчин и женщин. Соревнования проводились по швейцарской системе в 11 туров. У мужчин за титул чемпиона континента и 22 путевки на розыгрыш Кубка мира вели борьбу 322 спортсмена из 42 стран. Призовой фонд турнира составлял 100 тысяч евро.

Конкуренция в чемпионате была чрезвычайно острой. Исход соперничества решился лишь в заключительном туре, в котором в личном единоборстве встретились лидер турнира израильтянин Эмиль Сутовский и бывший краснодарский гроссмейстер, ныне живущий в Голландии, Сергей Тивяков. Напряженный поединок принес успех Сергею Тивякову, которой и стал победителем чемпионата. Его результат — 8,5 очка из 11 возможных.

Всего на пол-очка отстали гроссмейстеры Сергей Мовсесян (Словакия), получивший серебряную медаль, и россиянин Сергей Волков — бронзовая награда. В чемпионате приняли участие белорусские шахматисты. Наиболее успешно играл 19-летний минчанин, международный гроссмейстер Сергей Жигалко. Почти до самого финиша он сохранял реальные шансы попасть в число 22 лучших на Кубок мира. В последнем туре он встречался с румынским гроссмейстером Андреем Истратеску. Обоим соперникам нужна была победа. Но упорный поединок не выявил победителя и завершился вничью.

В итоге С.Жигалко набрал 7 очков и занял 45-е место. Если учесть, что по рейтингу он был лишь 119-м среди участников, то результат белоруса следует признать хорошим. Тем более что он сумел повысить свой индивидуальный коэффициент на 15 пунктов. И теперь по текущему рейтингу вышел на третье место в белорусском рейтинг-листе.

На очко меньше у троих белорусов, в том числе самых маститых — гроссмейстеров Алексея Федорова (Могилев) и Алексея Александрова (Минск). В итоге А.Федоров занял 108-е место, Андрей Жигалко — 116-е, А.Александров — 125-е. У минского гроссмейстера Сергея Азарова 5,5 очка, 156-е место.

В женском чемпионате континента приняли участие 157 спортсменок из 35 европейских стран. И здесь, кроме титула чемпионки, разыгрывались 13 путевок на розыгрыш Кубка мира среди женщин. Призовой фонд турнира составлял 40 тысяч евро.

Золотую медаль чемпионки выиграла украинка гроссмейстер Катерина Лагно, набравшая 8,5 очка из 11. Серебряной медалисткой стала Виктория Чмилите (Литва), бронзовой — Анна Ушенина (Украина).

В чемпионате выступили две белорусские шахматистки: международный гроссмейстер Анна Шаревич (Брест) и чемпионка Беларуси 2008 года международный мастер Наталья Попова. Брестчанка играла уверенно и завершила турнир с хорошим результатом — 6,5 очка из 11. Она заняла 42-е место и повысила свой рейтинг на 4 пункта. А вот дела у Натальи Поповой сложились не очень удачно. В результате, набрав в 11 встречах 4 очка, она финишировала лишь на 133-м месте.

Играют юные

В Минске прошло первенство Беларуси по быстрым шахматам среди юношей и девушек в возрастных группах до 14 и 16 лет. Соревнования проводились по швейцарской системе в 8 туров. У юношей в возрасте до 14 лет борьбу вели 32 спортсмена. На финише первым был минчанин Андрей Савицкий (СДЮШОР), набравший 6,5 очка. Всего на пол-очка отстали минчанин Дмитрий Гром (РЦОП), гомельчанин Владислав Битков и Евгений Петрушко из Барановичей. Следует отметить результат самого молодого участника 9-летнего Антона Шеремета из Осиповичей. Он набрал 4,5 очка из 8, заняв место в верхней половине турнирной таблицы.

У девушек в этой возрастной группе первенствовала минчанка Анастасия Зезюлькина — 6 очков из 8. На пол-очка отстали Кира Зайцева и Татьяна Рево (обе из Минска).

В первенстве юношей до 16 лет выступили 25 шахматистов. Победителем стал Максим Яромчук (Кобрин) — 6,5 из 8. Такой же итог у серебряного медалиста Александра Кочеева (Кобрин). А бронзовая награда досталась Андрею Свибовичу (Брест).

У девушек до 16 лет было 18 участниц. Лучший результат показала минчанка Ланита Стецко — 7 очков. На последующих местах Ольга Иванова — 6,5 и Ольга Чубакова — 5,5 (обе из Минска).

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Не здрадзім!

Шаноўныя прыхільнікі "Народнай волі"!

Не здрадзім адзін аднаму і на гэты раз: у другім паўгоддзі застанемся разам! Ужо сёння-заўтра можна аформіць **перадаплату** за нумары, якія будуць выходзіць у ліпені—снежні. Для гэтага, нагадваем, Вам толькі трэба завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем у чарговы раз.

Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары другога паўгоддзя — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь, июль				
август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь				
2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь, июль				
август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь				
2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за апрель, май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Ирак наказан на один год...

ФИФА приняла решение дисквалифицировать Федерацию футбола Ирака в связи с решением руководства этой страны распустить Олимпийский комитет.

Как сообщает АР, срок дисквалификации Ирака составит один год.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 27.05.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №